ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЛІСТАПАД 24 1933 г. ПЯТНІЦА № 259 (4803) Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ДА ВЕДАМА УСІХ АРГАНІЗАЦЫЙ УсеКП(б)

Рашэннем пленума ЦК УсеКП(б) адкрыццё XVII з'езда ЎсеКП(б) назначана на 25-га студзеня 1934 г.

ПАРАДАК ДНЯ XVII З'ЕЗДА:

1. Справаздачныя даклады: ЦК УсеКП(б)—дакладчык **тав. СТАЛІН**, ЦКК-РСІ—дакладчык **тав. РУДЗУТАК**, Цэнтральнай рэвізійнай камісіі—дакладчык **тав. ВЛАДЗІМІРСКІ**, дэлегацыі ЎсеКП(б) у ВККІ—дакладчык **тав. МАНУІЛЬСКІ**.

2. План другой пяцігодкі — дакладчыкі **т. т. МОЛАТАЎ і КУЙБЫШАЎ**.

3. Арганізацыйныя пытанні (партыйнае і совецкае будаўніцтва)—дакладчык **тав. КАГАНОВІЧ**.

4. Выбары цэнтральных органаў партыі.

НОРМА ПРАДСТАЎНІЦТВА І ПАРАДАК ВЫБАРАЎ

1) 1 дэлегат з рашаючым голасам на 1.500 членаў партыі.

2) 1 дэлегат з дарадчым голасам на 3.000 кандыдатаў у члены партыі.

3) Выбары праводзяцца на абласных, краёвых і рэспубліканскіх партыйных канферэнцыях.

4) Комуністы, якія знаходзяцца ў ячэйках, абслугоўваемых палітаддзеламі МТС і соўгасаў, чыгуначнымі палітаддзеламі і палітаддзеламі Чырвонай армі і войск АДПУ, праводзяць выбары на з'езд разам з астатнімі партыйнымі арганізацыямі на абласных, краёвых ці рэспубліканскіх партыйных канферэнцыях.

Сакратар ЦК І. СТАЛІН.

СПРАВА ГОНАРУ БОЛЬШЭВІКОЎ БЕЛАРУСІ

«Лён, што стаіць на полі ў шатрах, пакрыт лёдам. На сцелішчах асталося пад снегам каля 30 проц. усёй трасты».

Гэты факт мае месца ў адным з нашых асноўных ільнаводчых раёнаў —Лёзненскім. Становіцца зразумелым, чаму Лёзна пры сваіх багацейшых магчымасцях так ганебна адстала і ў апрацоўцы і ў здачы ільну. У гэтым ільнаводчым раёне лён апынуў ся ў ролі самага нешчаслівага пасынка.

Праўда, раённае кіраўніцтва не скупіцца на самыя гарачыя абяцанні. Праўда, і райком КП(б)Б, і РВК, і іншыя раённыя арганізацыі не раз бурным энтузіязмам абвяшчалі аб ператварэнні Лёзны ў адзучы вопытна-паказальны па ільну раён.

У іх руках былі і ёсць усе магчымасці. Лёзна, як указвае ЦК КП(б)Б у сваёй апошняй пастанове па дакладу сакратара лёзненскага райкома тав. Мацькова, самы магутны па ільнаводству раён у нашай рэспубліцы. Яна мае найбольшы вопыт па культуры ільну, найбольшыя кадры вопытных калгасных ільнаводаў.

Але раённае кіраўніцтва, як відаць, цвёрда паранылa паследаваць традыцыям тончароўскага Абломава. Вабіць сваёй прыгожасцю дакларацыі лёзненскіх кіраўнікоў аб вопытна-паказальным раёне па ільну. А канкрэтная практычная работа? Няма гэтай работы. Няма ў раёне сапраўднай барацьбы за лён.

ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове з усёй сілай падкрэслівае, што лёзненскі райком абмежаваўся голымі, пустазвонымі рэзалюцыямі. Ён не ўжыў ніякіх сапраўдных захадаў да своячасовай і высокаякаснай апрацоўкі ільну. Ён не змагаецца за хутчэйшае правядзенне такой важнейшай гаспадарча-палітычнай работы, як ільназагатоўкі. Да 20 лістапада раён выканаў план па здачы ільнасемя ўсяго толькі на 77,2 проц. Яшчэ горш з валакном і, асабліва, з яго якасцю—17,8 проц. задання, сярэдняя нумарнасць—6.

Не толькі для Лёзны характэрна такое становішча. І ў іншых раёнах можна знайсці не менш ганебнейшыя факты. Ход апрацоўкі і загатовак ільну прымушае гаварыць аб наяўнасці палітычнай недаацэнкі гэтай важнейшай справы, аб недапушчальным аслабленні барацьбы за лён.

Хіба не аб гэтым сігналізуюць ліцьбы? Да 20-га лістапада па рэспубліцы план здачы ільнасемя выканан толькі на 80,3 проц. Тэрміны-ж поўнага завяршэння здачы ўжо даўным даўно мінулі. А план па валакну выкапан усяго на 17,3 проц. І справа не толькі ў такіх марудненьшых тэмпах. Горш за ўсё тое, што і якасныя паказальнікі такоама не выкананы. У сярэднім здаваемае валакно ідзе ўсяго толькі 7-м нумарам.

Наша рэспубліка поўнасцю па ўсіх сектарах выканала план збожжапаставак. Гэты факт—новы яркі дакумант далейшага ўмацавання нашых калгасаў, новая перамога ў нашай барацьбе за калгасную заможнасць.

Чаму-ж так дрэнна стаіць справа па ільну? Матэрыялы, якія мы сёння змяшчаем у «Звязде», даюць красамоўны адказ. Трэба быць палітычным слепакоем, каб не разумець, што завяршэнне збожжапаставак не дае ніякага права на супакоенасць. Наадварот—і збожжапастаўкі і лён—адзіная справа, якая павінна быць поўнасцю і з поспехам даведзена да канца.

Адставанне па ільну—прамы рэзультат дэмабілізацыйных настрояў. Апартуністычная супакоенасць пасля завяршэння збожжапаставак, стаўка на самацёк—вось імя прычынам і дрэнных апрацоўкі ільну, і марудненьшых тэмпаў здачы ільнапрадукцыі.

13 тон валакна павінна штодзённа загатаўляць гарадоцкая ільнабаза. Загатаўляецца-ж максімум 5. Не ніжэй 8-га нумара павінна быць устаноўленая для тэтага раёна гатункавасць ільнавалакна. На базу-ж паступае валакно, нумарнасць якога дасягае самае большае 7—7,5, а, як правіла—6.

Усё гэта адбываецца на вачах у гарадоцкага райкома. Пры яго спакойным супраўдзе кулацкія агенты адкрыта прапавядуюць, што «па кліматычных умовах у Гарадку не бывае добрага ільну».

Пры яго патурацтве кулацкія гаспадаркі ў раёне адкрыта сабатуюць здачу ільнавалакна (з 284,9 цэнтн. яны здалі ўсяго толькі 4).

Стыль кіраўніцтва гарадоцкага райкома можна вычарпальна характарызаваць наступным фактам. Амаль да паловы лістапада кіраўнікі такога буйнейшага ільнаводчага раёна як Гарадок, ільном зусім (зусім!) не займаліся. І толькі прарыў начаў літаральна біць у вочы, людзі ўсхамянуліся, але... прыняўшы рад канкрэтных пастаноў, райком зноў сціхае і, па-ранейшаму, толькі канстатуе ганебнейшае адставанне свайго раёна.

Нелга цярпець больш такіх, з дазвола сказаць, метадаў работы, характэрных не толькі для Гарадка. У шчэ большай ступені гэта адносіцца да райкомаў і кіруючых органаў Мсціслаўя, Дуброўны, Суража, Чырвонаполля і іншых раёнаў, занесеных на чорную дошку.

Іх ганебнейшае адставанне—вынік славесна-дэкларацыйных метадаў кіраўніцтва, самацёчных настрояў і прымірэнцтва да кулацкага ахвосця.

Колькі ўжо часу і Крупкі, і Мсціслаўе, і Гарадок, і Чырвонаполле, і іншыя ганебна адстаўшыя раёны знаходзяцца на чорнай дошцы. Нічога новага не відаць на іх цёмных небасхілах, апроч ранейшага недапушчаль нейшага адставання.

Колькі-ж яшчэ напамінанняў патрэбна гэтым упартым і паслядоўным аматарам чорнай дошкі? НЯЖО-Ж КІРАЎНІКІ УКАЗАНЫХ РАЁНАЎ НЕ РАЗУМЕЮЦЬ, ШТО ІМ ЗРОБЛЕНА АПОШНЯЕ ПАПЯРЭДЖАННЕ, ШТО ЯНЫ АБАВЯЗАНЫ НЕАДКЛАДНА І НА СПРАВЕ ДАБІЦЦА КАРЭННАГА ПЕРАЛОМА. ПАРТЫЯ НЕ ПАЦЕРПІЦЬ ДРОБНА-БУРЖУАЗНАЙ РАСПУШЧАНАСЦІ, НАПЛЯВАЦЕЛЬСКІХ АДНОСІН ДА ЎСТАНОЎЛЕНЫХ ТЭРМІНАЎ. ГЭТА ТРЭБА ЦВЁРДА ЗАПОМНІЦЬ.

ЦК КП(б)Б ў сваёй пастанове па дакладу лёзненскага райкома дае вычарпальную праграму дзеянняў для ўсіх раённых арганізацый.

Усе сілы партарганізацыі, палітаддзелаў, комсамольскага актыва, сельсоветаў—на неадкладнае і большэвіцкае выкананне ўказанняў ЦК!

У нашых калгасах ёсць ужо не мала сапраўдных майстраў калгаснага ільнаводства, ізотавых ільна.

Старыя калгаснікі-ільнаводы, вопытныя калгасніцы-ільнатрапальшчыцы—сіла, якая пры правільным партыйным кіраўніцтве можа паказаць цуды. Поўнасцю скарыстаць гэту сілу, кінуць яе на ранаючыя ўчасткі ільнапрапоўкі, правільна арганізаваць работу на ўсіх працэсах—неадкладная справа кожнай партарганізацыі.

Трэба ўзняць усю масу калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў на барацьбу за лён, узброіць іх вопытам і энтузіязмам перадавых ударнікаў — майстраў сацыялістычнага ільнаводства, пакіраваць іх ярасць супроць кулацкага ахвосця, супроць кулацкай агентуры.

У тэрмін здаць лён і самай найлепшай якасці—гаварова **ЗАДАЧА БОЛЬШЭВІКОЎ БЕЛАРУСІ.** І яна павінна быць выканана!

АБ СКЛІКАННІ ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЛЁТА ПЕРАДАВЫХ ІЛЬНАВОДЧЫХ КАЛГАСАЎ

ПАСТАНОВА САКРАТАРЫЯТА ЦК КП(б)Б

У сувязі з набліжэннем фініша стаўнічай ільнаэстафеты, сакратарыят ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Склікаць на 20 снежня г. г. усебеларускі злёт перадавых ільнаводчых калгасаў з наступным парадкам дня:

1) Чарговыя задачы ільнаводчых калгасаў БССР у сувязі з лозунгам калгаснікаў Маскоўскай вобласці: «Совецкі лён павінен быць першым у свеце». (Дакладчык тав. БЕНЕК).

2) Выхінні стаўнічай ільнаэстафеты і вопыт барацьбы за першую арганізацыю ільнапрацоўкі і ільназагатовак. Даклядчыкі: Загатлён — ВАЙНОВІЧ, Ільнатрастарацэнтр — СЕЛІВАНАЎ, перадавы ільнаводчы раён — сакратар РК КП(б)Б і старшыня перадавога ільнаводчага калгаса.

3) Прысуджэнне пераходных сцягаў: чырвонага — першаму ільнаводчаму раёну і рагожнага — адстаючаму раёну па ільну.

2. Прадставіць цэнтральнай камісіі па спаборніцтву БССР з Заходняй вобласцю права канчатковага вызначэння месца злёта ў адным з перадавых ільнаводчых раёнаў па пазначэнніках на 20 лістапада.

3. Колькасны склад усебеларускага злёта ўстанавіць у 200 чал., у тым ліку: з перадавых раёнаў, з правам рашаючага голаса — 150 калгаснікаў (старшынь, намоснікаў па ільну, брыгадзіраў, паляводаў, ільнатрапальшчыц, сушыльшчыкаў), 5 сакратароў РК КП(б)Б, 5 начпалітаддзелаў і 5 дырэктароў ільнаводчых МТС, 5 дырэктароў ільназаводаў. Дапусціць да ўдзела ў злёце—з правам дарадчага голаса—30 чалавек з адстаючых ільнаводчых раёнаў, у тым ліку сакратароў РК КП(б)Б, начпалітаддзелаў МТС і калгаснікаў перадавых калгасаў.

У ліку далегуемых на злёт павінна быць не менш 40 проц. жанчын. Прадставіць цэнтральнай камісіі па спаборніцтву БССР з Заходняй вобласцю права канчатковага размеркавання месц па раёнах для ўдзела ў злёце з правам рашаючага ці дарадчага голаса ў залежнасці ад паказальнікаў ільнапрацоўкі і ільназагатовак на 5 снежня.

4. Для падрыхтоўкі да ўсебеларускага злёта перадавых ільнаводчых калгасаў зацвердзіць камісію ў наступным складзе т. т. СТЫРКЕ (старшыня), ВАЙНОВІЧ, СЕЛІВАНАЎ, СТРЭЛЕ, КУШНАРЭНКО.

Даручыць СНК БССР адпусціць патрэбныя асігнаванні, а Наркамснабу БССР харчаванне для правядзення злёта ільнаводчых калгасаў.

5. Прапанаваць цэнтральнаму і раённаму друку разгарнуць шырокі паказ хода падрыхтоўкі да ўсебеларускага злёта перадавых ільнаводчых калгасаў.

АДКРЫЛАСЯ ПАРТНАРАДА ПА КАДРАХ

23 лістапада ў 6 з палов. гадзін у зале паседжанняў ЦК КП(б)Б адкрылася партыйная нарада па кадрах, у якой прымаюць удзел начальнікі аддзелаў кадраў наркаматаў і ведамстваў, загадчыкі аддзелаў кадраў гаркомаў і райкомаў КП(б)Б, сакратары гарадоцкага, Капыльскага, Рагачоўскага РК КП(б)Б, дырэктары ВНУ, ВТНУ і тэхнікумаў.

Народу адкрыў сакратар ЦК КП(б)Б тав. ШАРАНГОВІЧ. З дакладам аб задачах у галіне падрыхтоўкі і выпучэння кадраў выступіў загадчык аддзела кадраў ЦК КП(б)Б тав. ДЗЕНІСКЕВІЧ.

ЗАВАЯВАЦЬ МЕСЦА НА УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЛЕТ ПЕРАДАВЫХ ІЛЬНАВОДЧЫХ РАЕНАЎ

БАЯВАЯ ЗАДАЧА КОЖНАГА РАЕНА, КАЛГАСА І КАЛГАСНІКА

Зводка аб ходзе загатовак ільнапрадукцыі

(Выкананне гадавога плана ў процантах на 20 лістапада 1933 г.)

Назва раёнаў	Загатоўле из ільнавалакна	Загатоўле из ільнасемя
ДРЫСЕНСКІ	70,8	98,6
СЕННЕНСКІ	51,7	101,3
ПОЛАЦКІ	47,4	101,3
УШАЦКІ	27,6	79,6
БЯЛЫНІЦКІ	26,0	76,6
ШКЛОЎСКІ	23,6	94,0
БЕШАНКОВІЦКІ	19,7	100,2
АСВЕЙСКІ	19,6	82,0
ЛЁЗНЕНСКІ	17,8	77,2
ГАРАДОЦКІ	17,4	99,4
ТАЛАЧЫНСКІ	15,3	81,6
ЛЕПЕЛЬСКІ	14,7	76,9
РАСОНСКІ	14,2	90,9
ЧАШНІЦКІ	12,8	94,4
СІРОЦІНСКІ	12,4	86,2
КРУПСКІ	10,5	74,9
ЧАВУСКІ	10,4	72,2
СУРАЖСКІ	8,5	99,2
ДУБРОВЕНСКІ	7,1	85,0
ГОРАЦКІ	6,4	73,2
МСЦІСЛАЎСКІ	5,7	84,6
РАЗАМ: ПА ІЛЬНЯНЫХ РАЁНАХ	20,6	87,2
УСЯГО ПА БССР	17,3	80,3

Чорная дошка

зрыўшчыкаў апрацоўкі і загатовак ільну

За зрыў апрацоўкі і загатовак ільну **на ўсебеларускую чорную дошку** заносяцца наступныя раёны:

Горацкі, Дуброўенскі, Крупскі, Мсціслаўскі, Суражскі, Чырвонапольскі

У ГАРАДКУ НІЯКІХ ЗМЕН

(Ад нашага спецкора)

На 20 лістапада па Гарадоцкаму раёну загатоўлена ільнатрасты 674,9 тоны — 16,9 проц. і ільнавалакна — 84,5 тоны — 12,2 проц.

Прырост па ільнавалакну за апошнюю пяцідзеўку — 5,7 проц.

Каб выканаць у тэрмін план загатовак ільнавалакна, кожная з 4-х баз раёна павінна загатаўляць штодзённа 13 тон, загатаўляюць-жа яны па 2-3 і самае большае па 5-6 тон.

Ігнаруюцца і якасныя паказальнікі. Устаноўленая па раёну гатунковасць ільнавалакна не павінна быць ніжэй 8-га нумара і ільнатрасты — № 1,45. Фактычна-ж на базу Загатільна паступіла ільнавалакно № 7,5 і ільнатраста № 1,32.

Дзе прычына такіх ганебных тэмпаў ільназагатовак?

Вось мы на цэнтральнай базе Загатільна. На дварэ дзесятак сялянскіх фурманак.

Здае ільнавалакно аднаасобнік вёскі **Кулі**, Кабінчанскага сельсовета, **Галаеў** Міхаіл. Частка ільну кепскай якасці. Спецпрыёмшчык **Доўгапольскі** вызначае яе № 6. Аднак, гэта ніколькі не перашкаджае яму адкрыта сказаць: «З такім ільнавалакном мірыцца яшчэ можна» і тут-жа гэты «спец» дадае:

— На кліматычных умовах нашага раёна добрага ільну ў нас не бывае.

Пад маскай спецыяліста гэты кулацкі агент вядзе агітацыю за зніжэнне якасці ільнавалакна, за зрыў указанняў партыі і ўрада аб выкананні не толькі колькасных паказальнікаў загатоўкі ільну, але і якасных.

Не лепш пастаўлена справа з якаснай прыёмкай ільнавалакна і на іншых базах. У прысланай на цэнтральную базу ад **меньшынскай** базы партыі ільнавалакна за № 8 два кудзелі валакна аказаліся шостага нумара. У партыі валакна, атрыманай ад **езярышчанскай** базы з указаннем, што ўсё валакно — № 8, звыш 4 цэнтн. аказалася на два нумары ніжэй. Такіх фактаў можна прывесці шмат.

Кулацкая версія, быццам нізкая гатунковасць валакна тлумачыцца кліматычнымі ўмовамі раёна, не знаходзіць належнага адпора з боку раённых арганізацый. Між тым факты гавораць за тое, што пры належнай апрацоўцы ў Гарадку можна дасягнуць патрэбнай фабрыцы гатунковасці ільнавалакна. Вось факты.

Калгас **«Чырвоны металіст»**, выканаўшы поўнасцю свой план па трасце, здаў звыш плана 200 кгр. ільнавалакна № 12.

Калгасы **«Чырвоны завод»**, **«Кастрычнік»**, **«Новыя баравыя»**, **«Другая пяцігодка»** і інш., дзякуючы добрай апрацоўцы ільну, здолелі здаць дзяржаве ільнавалакно № 10 і 12.

Аднаасобнікі вёскі **Саўчанні** Кузьмі ны Карніл і Пракоп, а таксама аднаасобнік вёскі **Шакурава** Буганаў Емельян здалі сваё валакно №№ 10 і 12.

Хіба гэтыя факты не разбіваюць ушчэнт кулацкую легенду аб тым, што ў Гарадоцкім раёне нельга дасягнуць высокаякаснай крадукцыі?

Асноўная прычына слабага хода ільназагатовак у тым, што раённыя арганізацыі вакол гэтай важнейшай справы не вядуць масава-растлумачальнай і арганізацыйнай работы.

Вось што таворыць, напрыклад, калгаснік с.-г. артелі «Чырвоны дырыкабль» тав. **Ануфрыеў.**

— Жанчыны да апошняга дня да апрацоўкі ільну ў нашым калгасе не прыцягваліся. На трапанні працуе ўсяго толькі двое мужчын. Праўленне не пакланацілася своячасова загатовіць дровы для мяльна-сушыльных пунктаў. Не забяспечылі нас і газай, так што ў большасці прыходзілася працаваць толькі днём. Вось чаму замест 7 цэнтнераў ільнавалакна наш калгас здаў толькі 86 кгр.

Такое-ж становішча ў калгасе **«Беларусь»** і ў радзе іншых.

Скаргзіца і аднаасобнік з вёскі **Цёпленька**, Палыінскага сельсовета, **Захараў.**

— За 18 кіламетраў ездзіў у Гарадок здаваць лён, а зараз з пустым-жа валакном прыходзіцца варочацца назад, па якасці забракавалі, маў, у сяродзіне лён кепска патропан. А вось у вёску да нас ніхто не прыходзіў, каб паказаць, як трэба апрацоўваць лён, каб не прыходзілася зараз за 18 км. з ім цягацца назад.

Больш сотні кулацкіх гаспадарак раёна адкрыта сабатуюць здачу ільнавалакна і ільнасемя. Замест прылічаючыхся з іх 284,9 цэнтн. ільнавалакна і 202,28 цэнтн. ільнасемя, да сёмнаццатага дня імі здана 97 цэнтн. ільнасемя і 4 цэнтн. валакна. Раённыя арганізацыі яўна ліберальнічаюць з кулакамі — сабатажнікамі загатовак. Ні адна кулацкая гаспадарка, ні адзін кулак-сабатажнік да гэтага часу не прыцягнуты да адказнасці.

Да 11 лістапада раённы камітэт партыі і райвыканком аб ходзе ільназагатовак маўчалі. Толькі 11 лістапада, калі стала відавочным, што загатоўкі ільнапрадукцыі зрываюцца, райком прыняў пастанову аб прыцягненні да адказнасці раду канкрэтных вінаватых зрыва. Але і пасля гэтага ніякага пералома ў раёне няма, бо пастанову паклалі ў шафу і ўсё ў раёне засталося па-старому.

А. ЗАРУБЕЖНЫ.

АБ АБАВЯЗКОВАЙ ПАСТАЎЦЫ МАЛАКА І МАСЛА ДЗЯРЖАВЕ У 1934 ГОДЗЕ

ПАСТАНОВА СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ САЮЗА ССР І ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА УсеКП(б)

Совет Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) пастанаўляюць:

1. Устанавіць на 1934 г. (з 1-га студзеня па 31-га снежня) ніжэйпаступныя спрэднія па рэспубліках, краях і абласцях нормы абавязковай, маючай сілу падатка, пастаўкі малака дзяржаве па ўстаноўленых дзяржаўных цэнах, асобна для калгасных двароў у калгасах, маючых малочна-таварныя фермы, асобна для калгасных двароў у калгасах, не маючых малочна-таварных ферм, і асобна для аднаасобных сялянскіх гаспадарак (у літрах на 1 карову ў год):

РАЁНЫ	Для аднаасобных сялянскіх гаспадарак	Для калгасных двароў у калгасах, не маючых малочна-таварных ферм	Для калгасных двароў у калгасах, маючых малочна-таварныя фермы
I. ГРУПА. Паўночны край, Заходняя-Сібірскі край, Уральская вобласць, Іванаўская вобласць	260	220	180
II. ГРУПА. Ленінградская вобласць, Маскоўская вобласць, Заходняя вобласць, Паўночна-Каўказскі край, Башкірская АССР, Татарская АССР	250	180	150
III. ГРУПА. Цэнтральна чарназем. вобласць, Украінская ССР, Горкаўскі край, Беларуская ССР, Сярэдня-Волжскі край, Ніжня-Волжскі край, Казанская АССР, Усходня-Сібірскі край, Далёка-Ўсходні край	170	110	80
IV. ГРУПА. Крымская АССР, Карэльская АССР, Горныя раёны Паўночн. Каўказа, Закаўказская СФСР, Калмыцкая аўт. вобласць, Кіргізская АССР, Узбекская ССР, Туркменская ССР, Таджыкская ССР, Якуцкая АССР	120	75	50

2. Устанавіць для малочна-таварных ферм і для агрэмаджанага стада калгасаў наступныя нормы абавязковай, маючай сілу падатка, пастаўкі малака дзяржаве (у літрах з каровы ў год):

РАЁНЫ	Малочна-таварныя фермы і агрэмаджанае стада калгасаў
I. ГРУПА. Паўночны край, Заходняя-Сібірскі край, Уральская вобласць, Іванаўская вобласць, Паўночна-Каўказскі край	560
II. ГРУПА. Ленінградская вобласць, Маскоўская вобласць, Заходняя вобласць, Башкірская АССР, Татарская АССР	520
III. ГРУПА. Цэнтральна-чарназем. вобласць, Сярэдня-Волжскі край, Украінская ССР, Беларуская ССР, Горкаўскі край, Ніжня-Волжскі край, Казанская АССР, Усходня-Сібірскі край, Далёка-Ўсходні край	470
IV. ГРУПА. Крымская АССР, Карэльская АССР, Горныя раёны Паўночнага Каўказа, Закаўказская СФСР, Калмыцкая аўтан. вобласць, Кіргізская АССР, Узбекская ССР, Туркменская ССР, Таджыкская ССР, Якуцкая АССР.	350

3. Размер пастаўкі малака малочна-таварнымі фермамі, калгасамі (у тым ліку комунамі) і аднаасобнымі гаспадаркамі вызначаецца па наяўнасці нароў на 1-XI—1933 г.

За ўтойванне сапраўднага пагаловя жывёлы ў агрэмаджаным стадзе калгасаў і калгасных таварных фермах устанавіць крымінальную адказнасць старшынь праўленняў калгасаў і загадчыкаў жывёлагадоўчых таварных фермаў калгасаў па арт. 62 крымінальнага кодэкса РСФСР і адпаведных артыкулах крымінальных кодэксаў іншых рэспублік.

4. У раёнах, дзе няма маспаробча-сыраваранных заводаў, за выключэннем суцэльна-малочных раёнаў, выкананне абавязацельстваў аднаасобнікамі, калгасамі і калгаснымі дварамі робіцца топленым маслам з разліку 1 кгр. масла на 25 літраў малака.

РАЁНЫ	I кварт.	II кварт.	III кварт.	IV кварт.
Паўночны край, Ленінградская вобласць і Карэльская АССР, Заходняя вобласць, Іванаўская вобласць, Маскоўская вобласць, Беларуская ССР.	20	40	30	10
Паўночна-Каўказскі край, Ніжня-Волжскі край, Уральская вобласць, Украінская ССР, Крымская АССР.	15	35	40	10
Горкаўскі край, Заходняя-Сібірскі край.	15	40	35	10
Башкірская АССР, Татарская АССР.	10	40	40	10
Цэнтральн. чарназ. вобл., Сярэдня-Волжскі край.	10	35	40	15
Казанская АССР, Кіргізская АССР, Усходня-Сібірскі край, Далёка-Ўсходні край.	10	35	45	10
ЗСФСР	5	45	45	5

6. Прапанаваць саюзнарэспубліканскім і аўтаномных рэспублік і краёвым (абласным) выканкомам устанавіць асобныя нормы здачы па раёнах з тым, каб зацвярджаныя гэтай пастановай сярэдняя нормы па вобласці, краю і рэспубліцы былі захаваны і выкананне плана здачы масла дзяржаве было поўнасцю забяспечана.

Пасля зацвярджэння параёвых норм здачы Наркамснабам СССР апублікаваць іх у мясцовым друку.

Безумоўна забараняецца мясцовым органам улады змяняць зацвярджаныя Наркамснабам СССР параёвыя нормы пастаўкі малака дзяржаве для калгасных ферм, агрэмаджанага стада калгасаў, комун, калгасных двароў і аднаасобных гаспадарак.

7. Абавязаць старшынь сельсоветаў і райвыканкомаў пад адказнасць СНК саюзных і аўтаномных рэспублік, крайвыканкомаў не пазней 25-га снежня ўручыць кожнай малочна-таварнай ферме, калгасу і комуне з агрэмаджаным стадам, калгаснаму двару і аднаасобнай гаспадарцы, маючай кароў, абавязацельствы па пастаўцы малака з указаннем пункта пастаўкі і з разбіўкай гадавой нормы пастаўкі па месяцах у адпаведнасці з устаноўленымі для раёнаў квартальнымі планамі загатовак.

8. Абавязаць старшынь сельсветаў весці ўлік выканання калгасамі, калгаснымі дварамі і аднаасобнымі гаспадарамі ўстаноўленых для іх абавязацельстваў па пастаўцы малака дзяржаве.

9. Калгасы, калгасныя двары і аднаасобныя гаспадарыі, не выконваючыя месячных абавязацельстваў па пастаўцы малака дзяржаве, падвяргаюцца пра шоваму штрафу ў памеры рынкавага кошта недавыкананай часткі абавязацельстваў са спагнаннем незданай часткі малака ў бясспрэчным парадку ў наступным месяцы звыш норм здачы гэтага месяца.

10. Абавязаць дырэктароў маспазаводаў варочаць здатчыкам малака адыходы ад пераапрацоўкі малака на масла (абрат) у колькасці: малочна-таварным фермам, калгасам (у тым ліку комунам) з агрэмаджаным стадам — 50 проц. ад вагі здаванага малака;

іншым гаспадаркам—35 проц. ад вагі здаванага малака.

11. Загатоўку малака і масла ў парадку даўнай пастановы ўсіялякі на масла-сыра-заводы і эпіўныя пункты Наркамснаба СССР і Цэнтрасаюза.

12. Устанавіць адказнасць па арт. 169 Кр. к. РСФСР і адпаведных артыкулах кодэксаў іншых рэспублік за спробу здзейсніць знятае, фальсіфікаванае (з прымешкамі) малако ў пік выканання абавязацельстваў, устаноўленых даўнай пастановай.

13. Прапанаваць Наркамснабу СССР па ўзгадненню з Цэнтрасаюзам зацвердзіць спісы раёнаў загатовак цельнага малака для снабжэння прамысловых цэнтраў і размеркавання раёнаў загатовак паміж трэстамі Гапоўмалако і Цэнтрасаюзам.

14. Практычнае правядзенне ў жыццё даўнай пастановы ўсіялякі на Наркамснаб СССР і на яго ўпаўнаважаных у рэспубліках, краях і абласцях.

15. Безумоўна забараніць мясцовым органам улады, а таксама загатоўчым арганізацыям укладаць на калгасныя таварныя фермы і агрэмаджанае стада калгасаў, на калгаснікаў і аднаасобнікаў абавязацельствы па пастаўцы малака дзяржаве ў памерах, перавышаючых нормы здачы, апублікаваныя ў адпаведнасці з даўнай пастановай. Забараніць таксама давать дадатковыя ці сустрэчныя планы па пастаўцы малака гаспадаркам, датэрмінова выканаўшым свае абавязацельствы, забяспечыўшым акуратным здатчыкам поўную магчымасць свабодна распараджацца лішкамі сваёй прадукцыі па свайму меркаванню.

Папярэдзіць усе партыйныя і совецкія арганізацыі, што асобы, вінаватыя ў дачы сустрэчных планаў, будуць прыцягнуты да крымінальнай адказнасці.

Старшыня СНК СССР В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).

Сакратар ЦК УсеКП(б) І. СТАЛІН

22 лістапада 1933 года.

ПРАВЕРКА РЭАЛІЗАЦЫІ ПАСТАНОЎ ЛЮТАЎСКАГА і САКАВІЦКАГА ПЛЕНУМАЎ ЦК і ЦКК КП(б)Б АБ НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ

БАРАЦЬБУ ЗА ПРОЛЕТАРСКІ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІЗМ—У АСКОВУ РАБОТЫ СОВЕЦКАЙ ШКОЛЫ

АЧЫСЦІЦЬ НАСТАЎНІЦКІЯ РАДЫ АД БУРЖУАЗНА-НАЦЫЯНАЛІСТЫЧНЫХ, КЛАСАВА-ВАРОЖЫХ ЭЛЕМЕНТАЎ

Буржуазным нацыяналістам не месца ў совецкіх школах

У працэсе чысткі бешанковіцкай раённай партарганізацыі выяўлены факты грубага скажэння ленінскай нацыянальнай палітыкі. Адсутнасць належнай барацьбы за пролетарскі інтэрнацыяналізм, адсутнасць большэвіцкай пільнасці прывялі да таго, што на радзе ўчасткаў ідэалагічнага фронта ажылі сабе гнёзды нацдэмаўскіх і вялікадзяржаўніцкіх элементаў, якія ў розных завуаляваных формах, пад той ці іншай маскай дзейнічалі супроць практычнага ажыццяўлення ленінскай нацыянальна-культурнага будаўніцтва, будаўніцтва нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зместу культуры.

Да апошняга часу ў рабоце адказнейшы участак работы — адцел народнай асветы — усталёўваў прымазаўшыяся да партыі былы эсэр **Цвяткоў**. Пры яго садзейнасці ў многія школы прыехалі настаўнічаць выхадцы з класава-чужога нам асяродзішча.

Калі адсутнічае большэвіцкая пільнасць

Варта было толькі сіроцінскаму пашу **Гарулеву** скінуць з сябе па тактычных меркаваннях рыгу, падстрыгчы сваю грыву і заявіць аб сваёй «шчыльнасці» да совецкай улады і вярнуцца ў Бешанковічы, як яго ў абдымках прымаюць і прапануюць настаўнічаць і загадваць Баранчыцкай школай. Зразумела, пош «настаўнічаў» і ў школе і праз школай у сваім кірунку. Райано не стоіць цікавіцца зместам работы у гэтай школе, колькі кланяўся аб пазбаўленні аўтарытэта стрыжанага пана. Для гэтай мэты на настаўніцкай канферэнцыі пад рукі духавога аркестра і групоў прапосвіцца гарэнтурам. Тут-жа яму прыцяпосвіцца ганаровая грамата як ударніку культурнага фронта за подпісам таго-ж **Цвяткова**, старшыні РВС **Рэйгольда** і загадчыка аддзела РК ВКП(б)Б **Камінецкага** (зараз працуе ў Менску сакратаром партканферэнцыі Эльвода). Усю гэтую ўрачыстасць у гонар «адарванага ад сала» самадзяйнаваў былы сакратар РК **Якаўлеў**.

Асноўныя масы абурэны. З месц паступаюць адзін за другім сігналы аб калецтве вучняў папоўскай ідэалогіяй і разлагаючай работе **Гарунова** ў мясцовым калгасе. Аб гэтых сігналах рэдактар раённай газеты тав. **Шыляйкоў** інфармуе тав. Якаўлева.

—Не друкуйце, треба дасягала праверыць, — дае ўстаноўку Якаўлеў.

Праверыкі. Але і гэтага аказалася мала. Треба стварыць спецыяльную камісію... І так прыпухла, пакуль наперакор гэтай даўнай асцярожнасці кіраўніка раённай партарганізацыі ў адносінах да папа раённая газета «Сталінец» не выступіла з выкрываўчым матэрыялам.

Нацдэмаўскае ахвосце акапалася ў бешанковіцкай і вярхоўскай школах

Пры такім патурані сацыяльна-чужым элементам у настаўніцкім складзе **вярхоўскай** ШКМ аказалася большасць выхадцаў з духоўнага стана. Узначальвае гэтую школу сын кулака **Ярошчыка. Бешанковіцкай** узорнай ШКМ загадвае былы дзяк **Вітноўскі**, а навучальнай часткай школы — кулак **Волкаў**. Абодвы яны ашуканчым шляхам прасачылі ў партыю. Выкладае літаратуру ў гэтай школе дачка дзяка **Карась**. Загадвае школьнай бібліятэкай пехта **Пятроса**, выхаванка «інстытута благародных дзяўчат».

Уся гэта кулацка-папоўская зграя праводзіць сваю шкодніцкую работу ў школе пад фальшыва-нацыянальным сцягам. У гэтых школах праводзіліся заняткі па нацдэмаўскіх падручніках. Аб комуністычным выхаванні і гутарцы не можа быць. Тут вучні выхоўваліся ў духу ідэалогіі беларускай контр-рэвалюцыйнай нацдэмаўшчыны.

Пры правяроцы бібліятэк у бешанковіцкай школе знойдзены сотні экземпляраў забароненай літаратуры. А ў вярхоўскай школе ў патаемнай скрыцы, дзе знаходзілася нацдэмаўская літаратура, хаваліся царкоўныя крыжы, падрасніцкі і інш. папоўскае барахло.

Як відома, класавы вораг у нашай краіне ў сучасны момант дзейнічае «ціхай сапай». Ні пацдзем, ні вялікадзяржаўнік не выказваюць адкрыта сваёй ідэалогіі. Нават тады, калі нацдэмаўская работа ў гэтых школах была выкрыта з усёй пільнасцю на чысткі ячэйкі, нацыяналістычнасці з партыйным білетам і ў **Вітноўскі** і **Волкаў** імкнуліся замазаць свае ўласныя справы пускаючы пыл у вочы салодзенькімі разважаннямі: «У нас нічога асаблівага не адкрылася, літаратура гэта была пакінута для азнаямлення з ёю настаўнікаў і толькі». Выступіўшы з апраўдальнай прамовай сваіх калег па ідэалогіі і справах настаўніца Карась імкнулася скампраметаваць камісію, заявіўшы: «Камісія сама не ведае сушнасці беларускай нацдэмаўшчыны».

Гэтыя манеўры арганізаванай групы нацдэмаўскага ахвосця тут-жа былі выкрыты і палітычна ацэнены. **Нацыянал-апортуністы Вітноўскі і Волкаў выкінуты з партыі.**

Трукі вялікадзяржаўніка Акуловіча

Калі давядаўся аб правядзімай чысткі школьных бібліятэк ад нацдэмаўскага хлама настаўнік **каўлякоўскай** школы **Акуловіч Всевалод**, ён выкарыстаў гэты выпадак, і пад выглядам ачысткі бібліятэкі ад шкодніцкай нацдэмаўскай літаратуры **пачаў знішчаць і пролетарскую беларускую літаратуру.**

Гэты ўчынак не выпадковы. Чаму гэта так зроблена, будзе зусім ясна, калі паглядзець хто такі Акуловіч. Акуловіч — сын попа, махровы вялікадзяржаўны шавініст. Калі ён у мінулым годзе загадваў школай, дык пры ўсякім зручным выпадку стараннa імкнуўся ігнараваць беларускую мову. Сярод сваіх прыхільнікаў ён гаварыў ка-яўшам: «Царыцць не магу я гэтай беларускай тэрміналогіі, ніяк мне не можа падабацца беларуская мова».

У гэтых словах Акуловіча не ўсё дагаворана да канца. Акуловічам не падабаецца не толькі беларуская мова і беларуская пролетарская літаратура, ім не падабаецца варт за ўсё самы факт існавання БССР у складзе Совецкага саюза, не падабаецца забяспечванае Расрычніцкай рэвалюцыяй роўнапраўе працоўных усіх нацыянальнасцей, якія ў цесным яднанні, пад кіраўніцтвам партыі з поспехам будуюць соцыялізм.

Акуловіч, як і ўсякі вялікадзяржаўны шавініст, выступае супроць нацыянальнай палітыкі партыі не права, а маскуючыся асцярожна, старанна ўтойвае сваё імкненне вярнуць страчаныя прывілеі панаваўшай раней у Расіі нацыі.

Нагадзіўвыя адносіны да беларускай мовы, супраціўленне беларусізацыі, адгаўчанне не палітычнага значэння — такавы найбольш распаўсюджаныя праяўленні ў БССР вялікадзяржаўных шавіністаў. Да чаго гэта вядзе? Гэта вядзе да распальвання нацыянальных пачуццёў сярод мас і ўзмацнае нацыі мясцовых буржуазных нацыяналістаў. Вось чаму ўхіл да вялікадзяржаўніцкага шавінізма ўсіляецца галоўнай небяспекай на даным этапе, супроць якога трэба весці ўзмоцненую барацьбу, ні на мінуту не паслабляючы агня супроць беларускай нацдэмаўшчыны і шавіністаў іншых колераў.

* * *

У сувязі з выкрытымі фактамі засмечанасці школ класава-варожымі элементамі, контр-рэвалюцыйнай дзейнасці ў пасобных школах беларускай нацдэмаўшчыны і вылазак вялікадзяржаўнікаў, пастановай бюро РК КП(б)Б, **выключан з партыі загадчык райана Цвяткоў.** Праведзена пазачарговая канферэнцыя настаўнікаў, на якой мабілізаваны асветніцкія масы на ўзмацненне барацьбы за пролетарскі інтэрнацыяналізм, за рашучую ачыстку школ ад нацдэмаўскіх, вялікадзяржаўніцкіх і інш. шавіністычных элементаў.

ІВАШЫН, БЛЮМКІН, ШЫЛЯЙКОЎ.

Аб цеганіне і бюракратызме з боку Менскага гарсавета ў адносінах да школы № 12

Пастанова ЦК ЛКСМБ ад 23-XI 1933 г.

У школе № 12 (Менск) дрэнныя ўмовы (жывуць прыватныя жыхары, вучні спедаюць і абедаюць у класных пакоях і г. д.).

Піянеры і дзеці не раз звярталіся ў гарсавет і да тав. **Каранеўскага** аб высяленні прыватных жыхароў і стварэнні ўмоў для нармальнай вучобы, аднак, да сённяшняга дня справа абмежавалася адныміабяцаннямі. Горш гэтага, сам старшыня гарсавета тав. Каранеўскі асабіста наведаў школу, ведае аб яе становішчы, абяцаў прыняць меры і да гэтага часу ніяк нічога не зроблена.

ЦК ЛКСМБ лічыць такія адносіны з боку Менскага гарсавета і яго кіраўніка яўна ненармальнымі.

ЦК патрабуе ад Менскага гарсавета спынення абяцаньняў і дэкларацый аб дапамозе школам, а па-большэвіцку — па сутнасці стварыць у школах горада Менска ўмовы, забяспечваючыя высокаякасную вучобу.

Праець Менскі ГК КП(б)Б абгаварыць і прыняць меры па паляпшэнню становішча ў школах Менска.

ПЛАДЫ СЛАВЕСНА-ДЭКЛАРАЦЫЙНАГА КІРАЎНІЦТВА

(Да вынікаў чысткі ячэйкі асветнікаў Менска)

У святле лёста т. т. **Гікало і Гападзе-беца** і інш. **Гобец**, напрыклад, у 1920 годзе ў «Правду» і пастановы сакавіцкага пленума ЦК і менскага ГК КП(б)Б перад партыйнай арганізацыяй асветнікаў Менска стаяла задача — рашучая і непрымірымая барацьба на два фронты ў справе правядзення ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі супроць ухілаў у бок вялікадзяржаўнага шавінізма, як галоўнай небяспекі, і супроць ухілаў у бок мясцовага шавінізма. Не менш важнай задачай заставалася была быць і барацьба за ажыццяўленне дырэктыў ЦК партыі аб школе.

Чыстка ячэйкі менскіх асветнікаў паказала, што бюро парт'ячэйкі з гэтымі асноўнымі задачамі не справілася. Сама партыйная арганізацыя асветнікаў да чысткі не змагла па-большэвіцку ўсярэдзіць усе агідныя праяўленні заціхлага самаарытыкі, засмечанасць класава-варожымі элементамі як самой партарганізацыі, так і раду школ. Яна не выявіла той самапільнасці, якая звіла сабе гнязда ў апараце гарана і ЦП саюза працаветы. **Партыйная ячэйка асветнікаў не здолела па-большэвіцку, ўсярэдзіць вылазак вялікадзяржаўных шавіністаў, беларускіх нацдэмаў і шавіністаў іншых колераў на фронце школьнага і культурнага будаўніцтва.**

У асобных школах мы мелі актывізацыю вялікадзяржаўных шавіністаў не толькі сярод беспартыйнага настаўніцтва, але і сярод членаў партыі.

Кравякоў—член партыі, які свой адпеты вялікадзяржаўніцкі твар выявіў яшчэ на рабоце ў Наркамасветы, менскім гарэне накіроўвацца загадчыкам 1-й беларускай ФЗС. Ні бюро ячэйкі, ні гарэна не праверылі, як Кравякоў на практычнай рабоце выпраўляе свае вялікадзяржаўніцкія памылкі. Гэты вялікадзяржаўнік так вучыў: **«Рускую рэвалюцыю пашчэн быў зрабіць рускі чалавек — Ленін. Многія прабавалі гэта зрабіць, але не ўдавалася, зрывалася. Толькі Ленін з яго ўнутраным рускім чуццём, з яго веданнем рускага народа, яго душы, псіхікі, здолеў гэта зрабіць. Руская рэвалюцыя павінна была адбыцца ў рускіх умовах, прыстасавана да іх і ў іх спецыфічнасці: рускі зіма, кажух, песельнасць натуры і характара рускага чалавека, — чужыя, незразумелыя кавказцу, грузіну з іх паўднёвым тэмпераментам».**

У часе сваёй персанальнай чысткі Кравякоў не ўскрыў сутнасці вялікадзяржаўнага шавінізма, усіх класавых карэнняў апошняга. Чават на пытанне камісіі — ці прызнае ён сваё вышэй указанае «вучэнне» за вялікадзяржаўны шавінізм, Кравякоў неахвотна адказаў: **«Называй це як хочаце, можаце называць вялікадзяржаўным шавінізмам».** У часе персанальнай чысткі Кравякова ніхто з членаў ячэйкі не выступіў з выкрыццём вялікадзяржаўных яго ўстановак. Больш таго, з боку асобных беспартыйных асветнікаў меліся выпадкі абароны гэтага вялікадзяржаўніка.

У асобных школах Менска меліся вылазкі беларускіх нацдэмаў, антысемітаў, яўрэйскіх шавіністаў, а бюро партыйнай ячэйкі гарэна і гарком працаветы праахвеліі моўчкі міма гэтых фактаў, або фіксавалі іх, а ў радзе вылаўлівалі проста патуралі класава-варожым нацыяналістычным элементам. У 39-й школе на працяку доўгага часу атуляваў класавы вораг. Настаўнік спеваў **Чарнякоўскі** навучаў дзяцей спяваць нацдэмаўскія песні. Антысемітызм загадчыка школы **Кірыка**, які заяўляў: « не настаў яшчэ час, калі ў нашай школе будуць працаваць яўрэі», — пераносіўся ў рады дзяцей. У розуль таце «выхаваўчай» работы гэтага «педагога» ў 39-й школе дапускаліся абзыванні яўрэйскіх дзяцей, і здзекі над вучаніцай-яўрэйкай, якая выкрыла антысемітызм. У школе вучні заяўлялі: «Мы не любім яўрэяў, і таму ўступаць у АЗЕТ не жадаем». Загадчык школы Кірык ла працяку доўгага перыяла вёў контр-рэвалюцыйную работу, сабіраў вакол сябе групку настаўнікаў нэкспіталт паказанага вышэй **Чарнякоўскага — Го**чыка гэтай школы **Сільвановіча** — антысовецкага элемента і п'яніцы. Зеньковіч знімае не загадчыка школы, а інжынера-вахтэра. Гэты факт больш чым яркі характарызуе становішча крытыкі і самакрытыкі ў гарэне.

На чысткі з усёй відавочнасцю выявілася, што і ў гарэна, і ў парт'ячэйцы існавалі самы грубы заціск самакрытыкі. Настаўнікі проста гаварылі—«папрабуй выступіць з крытыкай нашых «правадыроў», дык зараз-жа загоняць у раён. Крытыкуеш сакратара ячэйкі Яськевіча, помсціць інспектар гарэна Яскевіч, выступіш супроць Зеньковіча, атрымаеш і ад таго, і ад другога». Насценгазета была блазнай, людзі баяліся пісаць, заметкі ў большасці пішуцца пад псеўдонімамі. На заметкі ніхто не рэагаваў.

ЦК партыі даў дырэктыву мабілізаваць у Менску 100 лепшых настаўнікаў для ўмацавання рабфаў. **У гарэна гэта дырэктыва сабатавалася.** Зеньковіч замест лепшых ударнікаў пачаў вылучаць непрыгодных настаўнікаў, якія правальвалі работу ў школах, а ў некаторых выпадках і просты не нашых людзей. Так, быў вылучан настаўнік **Чыстоўсні**—былы поп, праваліўшы работу ў 32-й школе.

У рабоце ЦП саюза працаветы быў цэлы рад буйных палітычных прарываў. У практыцы кіраўніка ЦП **Нікалаеве** быў «очковтирательство», славесная дэкларацыйнасць, заціск самакрытыкі.

У самым Менску гарком працаветы працаваў зусім слаба. Такія важнейшыя пытанні, як матэрыяльнае забеспячэнне настаўніцтва, падарот саюзных арганізацый тварам да вытворчасці, соцыяльнае страхаванне настаўніцтва, мабілізацыя лепшых настаўнікаў - ударнікаў для пасылкі на вёску,—ажыццяўлялі ся гарком працаветы вусім слаба. Стары склад гаркома працаветы правалў работу. Новы дабіўся некаторага эруху, але гэты эрух далека неыбітарчальны. Треба проста сказаць, што работа і гаркома працаветы, і менскаму не адпавядае яшчэ тым задачам, якія прад'яўляюцца партыяй да прафарганізацый.

Нольга не ўказаць і на тое, што партыйная дысцыпліна ў ячэйцы асветнікаў стаяла на вельмі нізкім узроўні. Сходы наведваліся кепска, парнагрузкі не выконваліся. Старое бюро было за правал работы распушчана. У новае ўвайшлі тыя-ж таварышы на чале з **Яськевічам, Нікалаевым і Зеньковічам,** і працяку ў рабоце яшчэ больш пагаршаўся.

Усе прорывы з'яўляюцца рэзультатам таго, што на чале бюро ячэйкі і ў складзе бюро былі выхадцы з кулацкага сям'і. Сакратар парт'ячэйкі **Яськевіч** нават у час сваёй персанальнай чысткі імкнуўся **утаіць сваё соцыяльнае паходжанне.** Ён выдаваў сябе за сына рабочага менскага маёнтка, а на справе, як высветлілася на чысткі, бацька яго быў управаўляючым менскага маёнтка і разам з памешчыкам эксплуатаваў батрацкую. Загадчык гарэна **Зеньковіч** таксама аказаўся выхадцам з кулацкай сям'і. Ён разам з бацькам і братам мелі хутар з 62-х га зямлі. Сям'я Зеньковіча ў 1929 г. была раскулачана і выселена. Адзін з яго братоў працуе зараз у польскай дэфензыве. **Яськевіч** таксама мае аднаго брата ў Польшчы, з якім падтрымлівае сувязь. Брат з'яўляецца афіцэрам польскай арміі.

Гэтыя «кіраўнікі» ўчайшлі ў партыю для сваіх карыслых мэт. Яны скажалі лінію партыі, не вялі барацьбы з [illegible] крытыку, насаджвалі [illegible] халімства, патуралі класавым элементам.

Адхілены доход, на якім [illegible] вывады камісіі па чысткі, быў недазвалі пімаліцоцным. З неаслабнай увагай сход слухаў вывады. Камісія знайшла необходным бюро ячэйкі распусціць і настаўніц перад Наркамасветы і гарком партыі пытанне аб абнаўленні кіраўніцтва гарэна, а перад ЦК КП(б)Б—аб абнаўленні кіраўніцтва ЦП працаветы.

Пастановай камісіі па чысткі выключаны з **радаў партыі**: сакратар ячэйкі **Яськевіч**, як выхадзец з класава-варожай сям'і, які ўтаіў гэта ад партыі, праваліў партыйную работу; загадчык гарэна **Зеньковіч**, як выхадзец з кулацкай сям'і, скарыстаўшы партыю ў сваіх карыслых мэтах; **Чыстоўсні**, як [illegible], «очковтиратель» і заклопічык самакрытыкі; загадчык 25-й уборнай ФЗС **Цмыг**—як выхадзец з кулацкай сям'і і пазіцыі на якуістойлівы; настаўніца **Німімовіч**, як страціўшая партыйную класавую пільнасць; загадчык 1-й ФЗС **Кравякоў**, як вялікадзяржаўны шавініст; настаўніца **Дзержынкіна**, як скажаструбная партыю ў сваіх асабістых мэтах.

Асветнікі ў спрэдках на вывадах камісіі адмаўчаны заяўлялі, што чысткі ячэйкі прыходзіла да прыняцця больш-менш правільнай, што вывады камісіі вусім правільныя, што на гэтым вывадах асветніцкія масы павінны вучыцца, як трэба ў сваіх калектывах разгортваць большэвіцкую крытыку і самакрытыку, не мядзячы на асобы. Асветнікі заключылі сказалі, што яны мабілізуюцца на хутчэйшую ліквідацыю усіх тых прарываў на фронце культурнага будаўніцтва, якія былі ў крыты ў часе чысткі партыйнай ячэйкі.

В. ЗАЯЦАЎ.

Партарганізацыя Сенненшчыны ўмацоўвае сваю баяздольнасць

Мабілізаваўшы ўвагу ўсёй партарганізацыі на ліквідацыю глыбокага адставання, нанесены руйнуючы ўдар па ніцілках, малаверах і апартуністах, **Сенненскі** раён не толькі сышоў з чорнай дошкі, але і вышаў на перадавыя пазіцыі, асабліва ў барацьбе за лён. **План па ільнатрасце на 15 лістапада выкананы на 87 проц., па валакну—на 12,5 проц., па ільнасемю — на 101 проц.**

Сярэдні нумар здаваемага валакна па раёну — 9, па ільнатрасце — 1,45. Хаця раён яшчэ не можа гаварыцца ўзорным паказальнікам, але прыняты партыкіраўніцтвам і ўсёй партарганізацыяй меры па разгортванні масавай работы, спаборніцтва і ўдарніцтва даюць упэўненасць у павышэнні якасці.

Чыстка партыі яшчэ больш узняла актыўнасць працоўных мас **Сенненшчыны** на ўзмацненне барацьбы за выкананне гаспадарча-палітычных кампаній, за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне калгасаў, за заможнае калгаснае жыццё. Чыстка мабілізавала партарганізацыю на барацьбу супроць апартуністаў, шкурнікаў і ўсіх тых, якія, прыкрываючыся партбілетам, праводзілі і яшчэ там-сям праводзяць шкодную дзейнасць.

На 15 лістапада ў раёне прайшлі чыстку 19 партячэек. Праверана 93 членаў і 48 кандыдатаў партыі. Выключана з членаў партыі 26 чал. або 27,9 проц., з кандыдатаў—13 чал.—27 проц. Пераведзены з членаў у кандыдаты 9 чал.—ці 9,7 проц., з кандыдатаў у спачуваючыя 13 чал.—27 проц. Хто-ж выключан з партыі. Пераважаюць—3 чал., чужых элементаў—4 чал., маральна разлаклыўшыяся—12., парушальнікаў партдысцыпліны—30 ч., бюракратаў — 1 чал.

Засмечанасць партыйнай арганізацыі была адной з асноўных прычын доўгага адставання раёна па выкананні ст работ. Зусім правільна зрабіла камісія, калі, правяраючы кожнага комуніста, выкрыла, як ён рэагаваў на факты «очковтирательства», павялічэнні плошчы пасева былых кіраўніцтвам, як ён змагаўся на сваім участку за генеральную лінію партыі.

Там, дзе «кіравалі» чужыя элементы, апартуністы і шкурнікі, там за ўсю арудаў кулак, там быў правал у рабоце. Возьмем Ульянаўскі сельсавет. Ён увесь час знаходзіцца ў найгрубейшым прарыве. Незадаволеныя пастановы РІ і РВК не дзей вічалі на ўлітчэйскіх апартуністаў. Хто-ж там «кіраваў»? Старшыня с-с. —«комуніст» Фітнеціч —былы эсэр. У 1918 годзе ён служыў у эсэраўскім палку добраахвотнікам, прымаў актыўны ўдзел разам з сваім сябрыным братам, кіраўніком эсэраўскага атрада, у паўстанні супроць совецкай улады. Быў дэзертырам Чырвонай арміі. Калгасы сельсовета засмечаны кулакамі і былымі паліцэйскімі. У калгасе **«Новае сяло»** да самой чысткі «работаў» сын пана **Курасіч, Фітнеціч,** вецаючы аб гэтым, маўчаў, баючыся, што апошняя выкрыюць яго як эсэра і дэзертыра Чырвонай арміі.

А вось другая «комуністка» настаўніца **Пальчэўская**—дачка буйнага кулака. Яна не толькі ўтаіла свае мінулае ад партыі, а нават хадайнічала аб аднаўленні бацькоў членам калгаса і аб высяленні свайго брата, прытаворанага за контр-рэвалюцыйную дзейнасць.

Вялікую ўвагу і інтарэс праявілі працоўныя **Сянна** да чысткі калгаснай партыйнай ячэйкі, таму што добра ведалі мінулую і сучасную работу сенненскай калгаснай арганізацыі. У мінулым годзе па райсаюзу растрачана 30 тыс. руб., сёлета—5 тысяч рублёў. У апарадзе і магазінах райсаюза знайшлі сабе цёплы прытулак былыя ганцэляры і пасобнікі **Дзержкіна, Беленькі, Кісін, Хейфец,** і інш). Крамніца Давідзька растрацила 1.400 руб. Кіраўнікі райсаюза доўгі час не рашаліся праверыць і прыцягнуць Давідзька да адказнасці. Сама парт'ячэйка была засмечана людзьмі, нічога агульнага не маючымі з партыяй: дэзертырамі Чырвонай арміі, распратчыкамі. Характэрна, што парт'ячэйка зусім адарвалася ад мас, не гаворачы ўжо аб яной [illegible] палітгасавай і выхаваўчай работы сярод членаў ячэйкі.

Гарпо засмечана чужымі элементамі. Старшыня яго—«комуніст» **Чарнат** прыняў на работу былую ганцэлярку Дзодзіну, добра ведаючы аб яе мінулым. На запытанне камісіі, чаму ён гэта зрабіў, Чарнат адказаў: **«Нічога страшнага няма, абы добра працавала».** Старшыня райсаюза **Баравік** за час прабывання ў партыі (з 1926 г.) атрымаў некалькі партсцягнанняў: струсіў вымову за бюракратызм і адрыў ад мас, суровую вымову за адміністраванне, бюракратызм, вымову за п'янства і амаральнае разлажэнне. У 1930 годзе выключаўся з партыі, быў прыгаворан да 6 месяцаў прымусовай працы. Выступаючыя на чысткі выкрылі антыпартыйную работу **Баравіка**. За гроны райсаюза **Баравік** купляе сабе веласіпед, займаецца самапрэміраваннем.

Ачыстаўшы свае рады ад усіх чужых элементаў, партарганізацыя Сенненшчыны яшчэ больш умацуе сваю баяздольнасць; яшчэ больш загартуе і мабілізуе сябе для дальнейшай барацьбы за генеральную лінію партыі.

Малікін, Азарэнка.

ПРАЎДЗІН

Дырэктар-большэвік

Дырэктар завода «Большэвік» тав. БАНДАРЧЫК.

— Вы пытаецеся аб вартасцях і недахопах нашага дырэктара Бандарчыка? Яго вартасці — гэта выкананне праграмы, добрая якасць прадукцыі; яго недахопы — прарыў у знижэнні сабекошта...

Так адказаў стары стругаль другога хромавага цэха завода «Большэвік» Бедэнэс Саламон, падкрэсліваючы непарыўную сувязь, якая існуе паміж якасцю кіраўніцтва і выкананнем праграмы.

Зразумела, сваім вялікім пазамогам завод абавязан не аднаму дырэктару Бандарчыку. Завод — дзецішча першай пяцігодкі — вырас і прадзяе расці пад мудрым кіраўніцтвам комуністычнай партыі на чале з тав. Сталіным. Яго шосць умоў, пакладзеных у аснову работы завода, далі вялікшы станоўчыя вынікі. Тав. Бандарчык — адна з сустаўных частак партыйнага штаба, накіроўваючы дзейнасцю гэтага перадавога прадпрыемства. Пад вострым поглядам партыйнага калектыва, ад якога не ўхіляе ні адна яго памылка або недахоп, адчуваючы заўжды партыйны кантроль і таварыскую дапамогу, тав. Бандарчык упэўнена вырашае задачы, якія ўстаюць перад заводам.

Мощнае партыйнае кіраўніцтва, згуртаваны партыйны актыў, сотні лепшых ударнікаў, сорак базавых гаспадарча - разрахунковых брыгад — вось цяжкая артылерыя завода, якая вырашае перамогу. Але тав. Бандарчык — камандзір, ад яго ўмення кіраваць людзьмі, ад яго ўмення працаваць з людзьмі, ад яго ўмення загадваць людзям — залежыць вельмі многае.

І, вывучаючы работу «Большэвіка»—самага перадавога прадпрыемства БССР, аналізуючы шляхі яго перамог, пераконваешся, якая дасканалая фігура дырэктара-большэвіка, работага-вылучэнца, стаіць на чале чырвонасцяжнага калектыва.

* * *

Сын чорнарабочага. Яго падрыхтоўка да жыццёвага шляху пачыналася тры гады. Але ў паркоўна-прыходскай школе, дзе ён вучыўся, больш думалі аб выхаванні рабочага пакалення ў «страхе божием». Не вытрымаўшы экзамена па закону божаму, 14-гадовы Юзік Бандарчык адмовіўся ад гонара сядзець другі год у трэцім класе на «божай прамудрасці» і пайшоў на дражджавы завод Ракаўшчыка (цяпер «Чырвоная зорка») зарабляць на хлеб.

Два гады прапрацаваў Юзік на заводзе Ракаўшчыка. Зарабляў капейкі. Жыў галадаючы.

Гарбарня Сальмана была побач. Работа тут больш цяжкая, затое заработак крыху больш. І Юзік перайшоў працаваць на гарбарню.

З 1915 года да сённяшняга дня працуе тав. Бандарчык на гэтым заводзе. У Сальмана ён быў чорнарабочым. У Сальмана ён застаўся б чорнарабочым. На шчасце, у кастрычніку 1917 г. скоя чыласая ўлада Сальманаў. У другога гаспадара завода — у рабочага класа — іншыя разлікі. Рабочаму класу не да тавару трымаць найбольш здольных сваіх сыноў на чорнай рабоце. І тав. Бандарчык з першага-ж дня пераходзе ўлады ў рукі рабочага класа становіцца кваліфікаваным кажамарам, потым кваліфікаваным фальцэрам (стругалём).

У 1921 годзе пры арганізацыі на заводзе ячэйкі КП(б)Б, тав. Бандарчык **уступіў у рады партыі.**

Як актыўнага прамаўскага работніка, яго некалькі раз выбіраюць старшынёй заўкома. Пяць год у заўкоме, потым 8 месяцаў у ЦП саюза гарбароў былі для яго вялікай рабочай школай, «школай комуізма». 6-месячныя курсы ЦК КП(б)Б далі яму значную партыйную зарадку. І вось тав. Бандарчыка ў красавіку 1930 года высоўваюць на месцы дырэктара завода. З першых-жа дзён прабывання на адказным пасту, ён адпраўляе сваё назначэнне, уме ла кіруючы перабудовай старога чырвонадубнага цэха ў хромавы. За датэрміновы пуск цэха прэміраваны ВСНГБ.

Роўна праз год яго высунулі дырэктарам...

Тры з паловай гады тав. Бандарчык кіруе адным з буйнейшых прадпрыемстваў БССР. І ўсе тры з паловай гады **завод не ведае прарываў...**

* * *

— Самая лепшая ўласцівасць тав. Бандарчыка, — кажа загадчык планавага аддзела тав. Аксельрод, — гэта яго наватарства, яго адшуківаець на ўсякія рацыяналізатарскія прапановы рабочых і адміністрацыйна-тэхнічнага персанала...

Тав. Бандарчык ведае цану рабочай прапанове, ён высока цэніць рабочую ініцыятыву, рабочую здагадку.

За апошнія два гады ажыццёўлена звыш 600 рацыяналізатарскіх прапаноў, якія даюць больш 300 тысяч руб. эканоміі ў год.

Рабочыя, якія заслугоўваюць прэміявання, не чакаюць, як гэта адбываецца на іншых прадпрыемствах, па некалькі месяцаў, або па году. Прэміяванне ідзе зараз-жа за прыняццем прапановы, і гэта штурхае рабочых на далейшае вынаходства, выклікае новы паток рацыяналізатарскіх прапаноў.

І яшчэ адна цікавая рыса ў характары тав. Бандарчыка. Ён часта падае рацыяналізатару добрую мысль, добрую ідэю, штурхае на правільны шлях і, калі рацыяналізатару ўдаецца ажыццявіць гэту ідэю, дырэктар скромна стушоўваецца.

Шмат новага ўносіць тав. Бандарчык сам. Ён часта заўважае такія дробязі, якія праходзяць мімо вачэй іншых. Ён з'яўляецца адным з першых дырэктароў, якія ўмелі інстытут дапаможных рабочых у цэхах, каб кваліфікаваныя рабочыя не адрываліся ад варштатаў і машын на падноску і адносцы прадукцыі.

Соцпаборніцтва і ўдарніцтва для тав. Бандарчыка не дэкламацыя. Ён лепш многіх іншых дырэктароў ведае іх сілу і значэнне. Лепшым доказам гэтага з'яўляецца 40 гаспадарча-разрахунковых брыгад.

Усе брыгады завода — гаспадарча-разрахунковыя. За 8 месяцаў гаспадарча-разрахунковыя брыгады двух хромавых цэхаў далі 92.986 руб. эканоміі і атрымалі 6.599 руб. прэміяльных. Гэтыя лічбы гавораць аб тым, што ў гаспадарча-разрахунковых брыгадах ёсць улік (чаго няма на многіх іншых прадпрыемствах). Улік забяспечвае дзейнасць у рабоце брыгад, дапамагае сваё часова выкуліць вузкія месцы, дае магчымасць кіраўніцтву брыгад, цэхаў і ўсяго завода выкарыстоўваць тыя ці іншыя мерапрыемствы для барацьбы з недахопамі. Для ўліка старшыні брыгадзіры гаспадарча-разрахунковых брыгад вызваляюцца штодзённа на поўтары-тры ад работы з аплатай па сярэдняму заработку.

Усе гаспадарча-разрахунковыя брыгады маюць **тэхпрамфінплан.** Ідэю тэхпрамфінплана тав. Бандарчык сустрэў з такой-жа адшуківаецю, як і ідэю рацыяналізатарскую прапанову.

* * *

Многа ўвагі аддае тав. Бандарчык якасці прадукцыі. Не адзін дзесятак вытворчых нарад, прысвечаных якасці прадукцыі, склікаў тав. Бандарчык за апошнія некалькі месяцаў.

Зараз завод можа гаварыцца якасцю сваёй прадукцыі.

За дзевяць месяцаў завод не атрымаў ні адной рэкламацыі (скаргі на кепскую прадукцыю) на экспартны хром. Надзвычай. За першае паўгоддзе завод атрымаў ад Саюзпрамэкспарта 2.500 і ад «Союзкожбыта» 4.000 р. прэміяльных за высокую якасць прадукцыі. На нарадзе ПТР скуапрамысловасці ў Маскве 22 кастрычніка г. г. выступалі інжынерна-тэхнічныя работнікі ленінградскай фабрыкі «Скорогод» і адэскай абутковай фабрыкі з заявамі, што скуратавар «Большэвіка» лепшы за прадукцыю гарбарні «Комінтэрн» у Ленінградзе і іншых гарбарань Саюза.

Такую-ж ацэнку даў паместік кіраўніка Саюзскур тав. Серогін, пабываўшы ў канцы кастрычніка на заводзе.

І, нарэшце, вельмі добрую ацэнку ад Саюзпрамэкспарта атрымаў сталярскі экспартны клей, які выробляецца клеварным цэхам завода. Треба адзначыць, што ўпершыню ў **Совецкім саюзе** клеварны цэх завода «Большэвік» распрацаваў тэхналогію і арганізаваў выраб высокаякаснага экспартнага клею з адкідаў гарбарнай вытворчасці — хромавай стружкі.

* * *

Шмат добрага расказваюць аб сваім дырэктары старыя рабочыя завода тав. **Сянчук, Баравік Брэнісла**ў, **Душацкі, Рабіновіч, Таболін Мікалай Кузміч,** які разам з Юзікам Бандарчыком у малодасці галубоў ганяў, разам у экспедыцыі Сальмана працаваў, разам ад алетушаючых белапалякаў абараняў завод і зараз разам на адным заводзе: Юзік дырэктарам, а Мікалай браксрам. Але Мікалай зусім не крыўдзіцца, што прыцдель яго абагнаў па службовай лесвіцы.

— Ён дырэктар, я рабочы — якая розніца ?— кажа тав. Таболін. — **Разам пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі працуем. Ён на сваім посту, я на сваім...**

Так гладзець рабочыя на свайго таварыша, заняўшага на тым-жа заводзе высокі пост.

— **З такім дырэктарам прыемна працаваць,** — падтрымлівае думку рабочых тэхнарук клеварнага цэха хімік Шэр, у якога 33-гадовы вытворчы стаж і які за гэты час бачыў шмат начальства.

— Цвёрды большэвік і жыве заводам, — кажа і сакратар парткалектыва тав. Гелер.

Чырвонасцяжны калектыў завода «

ПЕРАБУДАВАЦЬ СІСТЭМУ КІРАЎНІЦТВА ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЯЙ

16 лістапада Наркамзем разаслаў ва ўсе раёны дакладныя ўказанні аб падрыхтоўцы жывёлы да зімоўлі. У разасланай дырэктыве было шмат пунктаў — аб будаўніцтве новых збор і свінарнікаў, аб уцяплянні старых памяшканняў, аб кармавых балансах, сіласе і інш. пытаннях, выкананне якіх забяспечвае пагалоўе цёплай зімоўкай.

Дырэктыва ўсеахапляючая, выразная. Але дырэктыва засталася пустой паперкай, бо следам за ёю не пашлі практычныя справы. Наркамзем і яго сектар жывёлагадоўлі, таксама як і Белаб'яднанне калгасных жывёлагадоўчых ферм, не паклапаціліся праверыць, што робіцца на месцах, як ажыццяўляюцца даныя ўказанні.

— Наша справа — планаванне. Мы-ж за раёны працаваць не будзем, — разважаюць работнікі Наркамзема.

Характарны выпадак з практыкі кіраўніцтва НКЗ. У канцы лістапада камісія выканання СНК СССР павінна заслухаць даклад НКЗ БССР аб забеспячэнні жывёлы на зімовы час. У Наркамземе ніжэй вестак аб гэтым няма. Тады ён камандзіруе ў раёны 10 спецыялістаў, якім даюць надрукаваныя схемы для запаўнення іх лічбамі аб пагалоўі, кармах, будаўніцтве і т. д.

Але большасць райса ведае аб усім гэтым не больш сектара жывёлагадоўлі Наркамзема, і камандыраваныя спецыялісты вярнуліся праз вокальны дзень у Менск або з незапоўненымі схемамі, або з лічбамі, узятымі са столі. Таварышы, якія сядзелі ў **Віцебску, Магілеў** амаль ніжэй вестак не прывезлі, бо там іх не аказалася, а тав. Клебанава, якая сядзіла ў **Асіпавічы**, прывезла такія лічбы, што не вецаш каму верыць. Тав. Клебанава прывезла весткі аб тым, што памяшканняў для жывёлы ў раёне больш чым трэба для паўнага забеспячэння пагалоўя, а намеснік загадчыка **Асіпавіцкага** райса заявіў 20 лістапада на нарадзе ў т. **Бекіна**, што тысяча галоў жывёлы застаюцца на зіму без памяшкання.

Дзесяць чалавек некалькі дзён казаліся, патрацілі дзяржаўныя грошы, а карысці ніякай.

— Дык вы-б хоць пасядзелі ў раёнах, паказалі, навучылі-б як трэба справу паставіць, — пытаем мы.

— Такога задання не было, — адказваюць яны. І мы вярнуліся назад.

А між тым, большасць раёнаў БССР да зімы не гатовы.

Два пытанні характарызуюць зараз падрыхтаванасць да зімоўкі жывёлы — карны і будаўніцтва.

Як стаіць справа з кармамі?

Возьмем азвін з найбольш забяспечаных раёнаў — **Крычаўскі**. З 71 калгаса 48 забяспечаны прыбыльнымі кармамі на 88 проц., сакавітымі — на 89, канцэнтраванымі — на 88 проц. 16 калгасаў рабіла забяспечаны кармамі менш чым на палову.

Чачэрскі раён выканаў план сенакашэння ўсяго толькі на 58 проц. Значная частка скошанага сена папала, намокла, згніла. Здавалася-б, што пры такіх умовах трэба было больш увагі звярнуць на сілас. Але план сіласавання выканан усяго толькі на 50 проц.

Калгас **«Кастрычніцкая рэволюцыя»** з'яўляецца буйнейшым у Ратамскім сельсавеце **Менскага** раёна. У калгасе 247 шт. буйнай рагатай жывёлы, 171 конь, 47 свіней, 50 авец. Пытанне кармавой базы мае для гэтага калгаса буйнейшае значэнне. Але што мы бачым? Салома, складзеная ў стагі, не была добра заверпана, прамокла і гніе. Ячмень, складзены ў недабудаваны хлеў, прамок і засяленеў. Салома ячменю ў корм жывёле не пойдзе. Калгасу трэба было засілаваць 450 тон, засілавана толькі 170 тон. Якасць гэтага сіласа вельмі нізкая, бо сіласная маса два тыдні ляжала каля вежы і гніла.

У радзе калгасаў **Асіпавіцкага** раёна праўленні калгасаў, паспаўшы пад-уцыльну кулацкай агітацыі, адмаўляюцца перадаць фермам кармавыя фонды, хоць балансы ўжо складзены і фонды вызначаны. А тым часам варожыя элементы разбазарваюць кармы, пакідаюць пагалоўе на весну без сена.

У выніку такіх апартуністычных, а часамі і шкодніцкіх адносін да стварэння кармовай базы, у значнай частцы раёнаў ствараецца яўная пагроза нястачы кармоў. Весь чаму ўжо зараз, у самым пачатку зімы, крыя размеркаванні калгасных даходаў трэба дабіцца складання ва ўсіх калгасах кармавых балансаў, з тым, каб поўнасцю забяспечыць пагалоўе кармамі.

Мала таго. Трэба дабіцца выканання пастановы партыі і ўрада аб поўнай перадачы калгасным фермам вызначаных для іх кармавых фондаў. Гэтым мы сапраўды дабіемся таго, што кармы пападуць на МТФ і СТФ.

Не менш важнай задачай з'яўляецца **закончэнне распачатага будаўніцтва і ўцяпленне старых памяшканняў**. Што ў гэтай галіне робіцца ні ў Наркамземе, ні ў райземаддзелах дакладных вестак няма. Райземаддзелы ўсю гэту справу, як наогул усю справу кіраўніцтва жывёлагадоўляй, здалі ў аренду аб'яднанням калгасных ферм, а Наркамзем — Белаб'яднанню калгасных ферм. У выніку будаўніцтва на калгасных фермах у значнай частцы раёнаў (**Магілеў, Віцебск, Шклоў, Бабруйск** і інш.) сарвана.

У **Асіпавіцкім** раёне з пачатых будаўніцтвам 12 збор, скончаны 3, з 13 свінарнікаў скончаны 8, з 10 пачатых будаўніцтвам кухань скончана 6.

У **Крычаўскім** раёне з пачатых будаўніцтвам 34 свінарнікаў скончана 23, кароўнікаў з 16 скончана 8.

Трэба ў бліжэйшыя-ж дні дабіцца рашучага зруху ў вырашэнні ўсяго комплекса пытанняў, звязаных з забеспячэннем усёй калгаснай жывёлы цёплай і сытай зімоўкай.

Наркам земляробства тав. **БЕНЕК** сурова папярэдзіў загадчыка райса Чачэрскага раёна т. **Гарбачова**, Крычаўскага раёна — т. **Лаўрэнева**, Асіпавіцкага раёна — тав. **Слёзберга** аб тым, што ў выпадку, калі яны ў бліжэйшыя дні не даб'юцца рашучага пералома ў справе падрыхтоўкі жывёлы да зімы, да іх будуць прыняты суровыя меры пакарання.

Гэтае папярэджанне адносіцца не толькі да загадчыкаў райса трох пералічаных раёнаў, але і да ўсіх астатніх раёнаў БССР, і ў першую чаргу да Беларускага аб'яднання калгасных ферм і сектара жывёлагадоўлі. Мала складаць планы, мала спускаць дырэктывы. Наркамзем павінен па-большэвіцку, аперацыйна пачаць кіраваць гэтай справай.

Тэмпы і метады пасёўнай і ўборачнай павінны не ў меншай меры ўжывацца і ў справе захавання ўсяго пагалоўя. У гэтым годзе мы павінны дабіцца значнага роста ўсяго пагалоўя МТФ і СТФ за кошт прыплода, а для гэтага трэба на ўсіх фермах стварыць патрэбныя ўмовы.

У першую чаргу гэта залежыць ад апарата Наркамзема, які павінен вытрушчць з практыкі сваёй работы канцылярска - бюракратычныя метады кіраўніцтва, спусціцца з канцылярый у раёны, у сельсоветы і калгасы, каб там, на месцах разам з мясцовымі партыйнымі і савецкімі арганізацыямі дабіцца стварэння высокаякаснай жывёлагадоўлі ў БССР.

Л. К.

РЭЙД КК-РСІ І ДРУКУ

„Другая запаведзь—ссыпка насення" (СТАЛІН)

ПЕРАТВОРЫМ РЭЙД У МАСАВЫ ПАХОД УСЯГО КАЛГАСНАГА АКТЫВА ЗА НЕАДКЛАДНАЕ ЗАВЯРШЭННЕ ЗАСЫПКІ НАСЕННЯ І ВЫСОКАЯКАСНАЕ ЯГО ЗАХАВАННЕ

КЛОПАТЫ АБ НАСЕННІ—КЛОПАТЫ АБ УРАДЖАІ БУДУЧАГА ГОДА

Выкананне плана збожжапаставак — першая запаведзь, — сказаў тав. Сталін. — Гэтыя словы яго і лозунг аб калгаснай заможнасці былі ўсвядомлены не толькі партыйнымі і савецкімі арганізацыямі, але ўсёй масай калгаснікаў, якія пад кіраўніцтвам партыі з першых-жа дзён уборкі прыступілі да выканання сваіх абавязкаў і зараз поўнасцю разлічыліся з дзяржавай.

Ударная праца на полях у часе сяўбы і уборкі дала высокі ўраджай, забяспечваючы значнае павышэнне калгасных даходаў. У БССР ужо зараз не мала калгасаў, якія, пасля выканання сваіх абавязкаў перад дзяржавай і ссыпкі насенных і страхавых фондаў становяцца заможнымі, атрымліваюць на працадзень па 4-5-6 кіло збожжа. У калгаснікаў ствараюцца значныя хлебныя пішні, якія яны могуць рэалізаваць у парадку калгаснага гандля і задаволіць свае гаспадарчыя і культурныя патрэбы.

Аднак, для таго, каб канчаткова размеркаваць ураджай, разгарнуць калгасны гандаль хлебам, неабходна не толькі выканаць дзяржаўныя абавязацельствы, але і ссыпаць насенныя і страхавыя фонды. Калгасны гандаль хлебам можа быць дазволен толькі ў тых рэспубліках і вобласцях, якія, выканаўшы поўнасцю свае абавязкі па здачы збожжа па ўсіх відах і сектарах, разам з тым выканаюць і другую запаведзь — ссыпку насенных і страхавых фондаў.

Пры гэтым ні ў якім разе нельга спадзявацца, што насенне будзе ссыпана механічна, сакрэцкем, што пераможаны ўжо ўсе труднасці на гэтым участку.

Насенне—рашаючае звяно ў калгаснай вытворчасці. Ад добраякаснага насення, ссыпанага ў запаведнасці з плошчамі яравых культур, будзе залежаць ураджай будучага года.

Хіба трэба здаўляцца, што імкнена да насення зараз працягваюць рукі ворагі калгаснага лада, педыкулачніці і шкоднікі. Ім дапамагаюць тыя гора-кіраўнікі калгасаў, якія сваёй бестурботнасцю ставяць пад удар ссыпку насенных фондаў.

Весткі з пасобных раёнаў БССР сігналізуюць, што вагол ссыпкі насенных і страхавых фондаў зусім не мабілізавана ўвага калгаснага сялянства. Вось прыклады:

У калгасах «ЧЫРВОНЫ ПРАМЕНЬ» і «ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ» (Рагачоўшчына) насенне ссыпана неадсартаваным, сырым. У засекі яго ссыпалі тоўстым пластом, зусім за ім не сачылі. Насенне пачало псавацца.

У некаторых калгасах ЗЕМБІНСКАГА сельсавета (Барысаўшчына) ссыпку насенных фондаў падмяняюць складаннем актаў. У калгасе «СЕРП І МОЛАТ» склалі акт аб ссыпцы насенных і страхавых фондаў у той час, калі нават не была абмалочана патрэбная колькасць збожжа.

У калгасе «ЎДАРНІК» дагэтуль не скончан абмалот, 600 пуд. жыта і 400 пуд. аўса яшчэ ў снапах. Насенныя фонды не ссыпаны. Не гледзячы на гэта ў калгасе прыступілі да размеркавання ўраджаю. У калгасе «ПРОЛЕТАРСКАЯ ПЕРАМОГА», таго-ж сельсавета, дагэтуль не абмалочана каля 800 пуд. жыта і 400 пуд. пшаніцы. Насенныя фонды таксама не ссыпаны. Гэта, аднак, зусім не перашкодзіла праўленню пад выглядам аванса размеркаваць сярод калгаснікаў 50 проц. збожжавых культур і ўсю бульбу.

Гэтыя факты гавораць аб спробах кулацкіх элементаў расцягнуць, разбазарыць насенне.

У святле гэтых фактаў вялікае значэнне набывае Усебеларускі рэйд праверкі ссыпкі і хавання насення, які праводзяць ЦКК-РСІ БССР і «Звязда» з 25 лістапада па 15 снежня.

Задача рэйда — дапамагчы партыйным арганізацыям мабілізаваць вакол ссыпкі і хавання насення шырокія калгасныя масы, нізавы калгасны актыў, нізавы раённы друк.

Барацьба за насенне павінна весціся з не меншай сілай, чым барацьба за збожжапастаўкі.

Работу па стварэнню насенных фондаў можна лічыць закончанай толькі тады, калі ўсё насенне ў адпаведнасці з пасёўнымі плошчамі добра ачышчана, адсартавана і мае нармальную вільготнасць. Сартаванне і ачыстка насення памяншае вільготнасць і папярэджвае псаванне яго.

Калгасныя свірны з насеннем трэба ўзяць пад пільны нагляд. Не трэба забываць, што вялікая маса насення ў калгасных свірнах, калі за ёю не будзе пільнага догляду, можа псавацца. Для нагляда за свірнамі з насеннем павінны быць выпучаны лепшыя, праверэныя калгаснікі.

Інтарэсы шырокіх мас калгаснікаў патрабуюць, каб насенныя і страхавыя фонды былі ссыпаны ў самы кароткі тэрмін, каб насенне было ссыпана лепшым зернем. Клопаты аб насенні — гэта клопаты аб яшчэ больш высокім ураджаі будучага года, аб яшчэ больш паўнавесным працадні і заможным калгасным жыцці.

Ссыпаюць неачышчанае насенне

РАГАЧОЎ. (Наш кар.).

Пытанне аб размеркаванні ўраджаю і ссыпцы насенных і страхавых фондаў раённыя арганізацыі ў Рагачоўскім раёне адкладвалі на пасля. А потым аб ім зусім пачалі забываць. Тэлеграма сакратара ЦК тав. Гікало райкому, аб дачы вестак аб размеркаванні ўраджаю і ссыпцы насенных і страхавых фондаў, была вельмі нечаканай для раённага кіраўніцтва. Яе не чакалі «так рана».

Ні райком, ні РВК і райса не ведалі дакладна, што робіцца ў сельсоветах па гэтаму пытанню.

У сельсоветы і калгасы былі пасланы тэрміновыя распараджэнні, запытанні. Запрацаваў тэлефон.

З раёна ад сельсоветаў патрабавалі тэрміновых вестак аб размеркаванні ўраджаю і ссыпцы насенных і страхавых фондаў.

— Як-жаідзе ссыпка насенных і страхавых фондаў у калгасах і колькі калгасаў ссыпалі іх, — запыталі ў загадчыка райса т. Еўдашкова.

Ён не знайшоў што адказаць.

— Я паклічу нашага вучотчыка Бычкова. Толькі Бычкоў гэта ведае, — адказаў Еўдашкоў.

Па вестках Бычкова, які толькі адзін у райса што-небудзь ведае аб ссыпцы фондаў, ссыпалі насенныя фонды збожжавых з 130 калгасаў раёна толькі 98. Бульбу насенную ссыпалі 79 калгасаў. Фуражны фонд стварылі ў 101 калгасе.

Якія калгасы ссыпалі і колькі чаго ссыпалі, і Бычкоў не ведае. У райса не ведаюць таксама і пра размеркаванне ўраджаю. Гадаюць, што размеркаван ураджай у 99 калгасах. У якіх калгасах, колькі выйшла на працадзень і ці правільна праведзена размеркаванне, аб гэтым ніхто не ведае.

У сельсоветах яшчэ і на сёння не арганізаваны зерначышчальныя абозы. У многіх калгасах збожжа ў насенны фонд ссыпаюць неачышчанае, неадсартаванае і зусім вільготнае.

Напрыклад, у калгасах «Чырвоны прамень» і «Чырвоная армія» насенне збожжа ссыпана неадсартаванае і вільготнае. У засекі яго насыпалі тоўстым пластом і не пералапацілі яго. Збожжа нагрелася і пачало гарэць.

Калгасы абіваюць пароги райса і МТС, каб ім далі планы яравой сяўбы на 1934 год. Па гэтых планах яны змаглі-б ссыпаць насенныя фонды. Але-ж у райса ніхто і не думаў складаць іх, хоць кантрольныя лічбы яравой сяўбы на 1934 год ужо вядомы райса. Наркамзем у час спусціў іх.

У іншых калгасах пры размеркаванні ўраджаю, каб «не пакрыўдзіць» гультаёў і прагулышчыкаў: ім дакамагаюць «натурай».

Напрыклад, у калгасе «Пераможац» гультаю, кулаку падпявалу, злоснаму прагулышчыку Дземідаву Купрою выдалі 5 пуд. жыта.

У гэтым-жа калгасе 3 тыс. пуд. бульбы, якая прызначана для размеркавання, забуртавана ў канцы.

— Будзем размяркоўваць вясной, — гаворыць калгаснікам старшыня гэтага калгаса Кухараў.

ВЯРХОЎСКІ.

УСЕБЕЛАРУСКІ РЭЙД КК РСІ і ДРУКУ

Адзначаючы зусім нездавальняючы ход ссыпкі насенных і страхавых фондаў, а таксама недобраякаснага захавання насення, ЦКК РСІ і рэдакцыя газеты «ЗВЯЗДА» з 25 лістапада па 15 снежня арганізуюць усебеларускі рэйд КК РСІ і друку для праверкі і дапамогі партыйным арганізацыям у найхутчэйшым сканчэнні ссыпкі насенных фондаў і добраякаснага іх захавання.

Усім райКК РСІ, райгазетам, газетам палітаддзелаў МТС і соўгасаў прапануецца ўключыцца ў рэйд. Для ўдзела ў рэйдзе—прыцягнуць шырокі актыў РСІ, лёгкай кавалерыі, нізавы друк калгасаў і соўгасаў і рабселькораў.

Для аперацыйнага кіраўніцтва рэйдам пры РКК РСІ арганізуецца штаб з прадстаўнікоў КК РСІ, райгазет, газет палітаддзелаў, РК ЛКСМБ і РВК.

Ход рэйда павінен шырока асвятляцца на старонках нізавога, раённага, палітаддзельскага і цэнтральнага друку.

Райштабам прапануецца дасылаць пяцідзённы аперацыйны матэрыял аб ходзе рэйда ў ЦКК РСІ, рэдакцыю газеты «Звязда».

ЦКК РСІ, «ЗВЯЗДА».

ГАЛОЎНЫ КОРПУС УНІВЕРСІТЭЦКАГА ГАРАДКА Ў МЕНСКУ.

АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ КАДРАЎ ТРАКТАРЫСТАЎ, БРЫГАДЗІРАЎ І МЕХАНІКАЎ

Пастанова ЦК ЛКСМБ і палітсектара НКЗ БССР

Надаючы асабліва палітычна-важнае значэнне пытанню падрыхтоўкі, падбора і перагляду кадраў трактарыстаў, брыгадзіраў і механікаў і ўмацавання гэтых кадраў комсамольскай праслойкай, ЦК ЛКСМБ і палітсектар НКЗ БССР пастанаўляе:

1. Зацвердзіць развёрстку па КСМ арганізацыях аб накіраванні ў Рагачоўскую школу механікаў 32 комсамольцаў, у школы брыгадзіраў (Слуцак, Слонім, Гарадок)—103 комсамольцаў, на курсы трактарыстаў ва ўсіх МТС — 1.000 комсамольцаў.

2. Прапанаваць Рагачоўскаму, Слуцкаму, Сенненскаму і Гарадоцкаму РК КСМ і кампалітам па КСМ неадкладна абгаварыць і прыняць належныя меры па арганізацыі школ (памяшканне, выкладчыкі, пастаноўка палітпрыхаваўчай работы і г. д.). Усім ГК і РК КСМ выдучыць і абавязаць прыняць актыўны ўдзел членаў бюро ГК, РК (з рабочай тройкі) у прыёмачных камісіях МТС, раёна, школ, курсаў з тым, каб забяспечыць высокаякасны, класава-вытрыманы адбор і камплектаванне школ і курсаў. Ускласці адказнасць за бесперабойную работу школ і курсаў персанальна на сакратароў РК, ГК і кампалітаў па КСМ.

3. Прапанаваць усім ГК, РК і кампалітам па КСМ, МТС не пазней 25 лістапада закончыць адбор згодна існуючых правіл і фальсфікі і адкамандаванне кандыдатур як у школы, так і на курсы.

4. Усім ГК, РК і кампалітам па КСМ правесці па згодзе з начальнікамі палітаддзелаў і РК КП(б)Б з 25 лістапада па 1 снежня праверку-пераатэстацыю па ўсіх МТС склада кадраў трактарыстаў, брыгадзіраў і механікаў з мэтай устанаўлення соц. склада гэтых кадраў і іх ступені падрыхтаванасці кіраваць машынай (кваліфікацыя).

5. Не пазней 1-га снежня па ўсіх раёнах, МТС і калгасах сілами комсамола правесці ўлік резервуў трактарыстаў, механікаў і брыгадзіраў, таксама і іншых спецыяльнасцяй з тым, каб лічныя, сацыяльна падыходзячых з іх перападрыхтаваць і замацаваць на рабоце ў МТС, калгасе, соўгасе.

Абавязаць усе ГК і РК КСМ вярнуць на работу ў МТС усіх комсамольцаў-трактарыстаў, не працуючых зараз на гэтай рабоце.

6. Лічыць, як праяліла, што сіламі КСМ арганізацыі не пазней як да 1 снежня павінны быць арганізаваны ў кожнай МТС, соўгасе таварычныя гурткі і бюро кансультацыі па адноўных элементарных тэхнічных ведах, з мэтай да памогі ў павышэнні кваліфікацыі кожнага брыгадзіра, трактарыста, механіка і г. д.

Прапанаваць усім комсамольскім арганізацыям наладзіць у арганізуемых школах і курсах такіх-ж гурткі і кансультацыйнае бюро.

Лічыць неабходным у канцы лютага і пачатку сакавіка 1934 года правесці па ўсіх МТС і соўгасах тэхнічны экзамен трактарыстаў, брыгадзіраў і механікаў. Даручыць вытворча-тэхнічнаму аддзелу ЦК распрацаваць умовы і правілы правядзення тэхэкзамена.

7. Адзначаючы велізарную ролю, якую адыграў у мінулым годзе конкурс трактарыстаў у справе павышэння прадукцыйнасці работы і сацыялістычных адносін да работы кожнага трактарыста, лічыць неабходным у 1934 с.-г. годзе правядзенне другога тура конкурса трактарыстаў. Даручыць штабу спаборніцтва распрацаваць і ўнесці на зацвярджэнне бюро ЦК і палітсектара правілы і ўмовы 2-га тура конкурса трактарыстаў.

Абавязаць усе ГК, РК і кампалітаў па КСМ, а таксама аддзел асветы і кадраў ЦК па ўказанні з здзеўнымі арганізацыямі абвясціць спаборніцтва на лепшае сканчэнне школ і курсаў.

Паставіць пытанне перад Наркамземам і Трактарацэнтрам аб выдзяленні прэміяльнага фонда для навучэўчых сем, бібліятэк, газет і часопісяў.

8. Даручыць аддзелу асветы і кадраў ЦК з прыцягненнем мясцовых арганізацый да 5-та снежня правесці склад выкладчыкаў, бытавыя і культурныя ўмовы школ па падрыхтоўцы брыгадзіраў і механікаў.

9. Даручыць аддзелу ЦК не пазней 23-га лістапада падабраць і накіраваць на работу чатырох партыйцаў-комсамольцаў на пасаду нам. загадчыкаў школ, а таксама даць указанне аб арганізацыі і пастаноўцы работы комсамольскіх ячэек у гэтых школах.

10. Абавязаць аддзел асветы і кадраў ЦК у 3-дзённы тэрмін склікаць нараду замяснікаў арганізацый па пытанні рэалізацыі імі пастаноў, вынесеных нарадаю комсамольскіх работнікаў «па рэмонту трактараў і падрыхтоўцы кадраў».

Аддзелу асветы і кадраў ЦК паставіць кіраўніцтва школамі і курсамі так, каб сакратарыят ЦК нераздзей аднаго разу ў дэкаду ведаў аб становішчы ў школах і на курсах.

11. Прысвяціць у снежні месяцы адзін сакзны дзень на ўсіх комсамольскіх арганізацыях пытанню «аб становішчы с.-г. кадраў».

12. Даручыць рэдакцыям газет «Чырвоная Змена», «Юнгер арбейтэр» рэгулярна асвятляць і паказваць на сваіх старонках, як праходзіць падрыхтоўка кадраў, як асвяцяцца кожнай комсамольскай арганізацыяй мерапрыемствы ЦК і палітсектара па падрыхтоўцы правяла і замацавання кадраў.

Да ўсіх загадчыкаў клубаў і бібліятэк БССР

(Адкрыты ліст)

Арганізацыя сеткі бібліятэк пры палітаддзелах МТС, памяшканне іх лепшай літаратурай, творамі Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна мае выключнае палітычнае значэнне. Мы, бібліятэкары горада Менска, уключаемся ў бібліятэчную перакліч па збору марксіцка-ленінскай літаратуры для палітаддзельскіх бібліятэк, арганізуемую бібліятэкай імя Горкага ў Нова-Обіроку. Мы вылучаем з нашых бібліятэк лепшую палітычную мастацкую літаратуру і абавязваемся прадставіць яе ў культаддзел ЦОПСБ не пазней 25-Кі для перадачы палітаддзелам.

Выказваем пасведчаць нашаму прыкладу ўсе бібліятэкі БССР.

Заг. бібліятэкай клуба харчавікоў ЗОНТАВА.
Метапістаў ЗАГУРСКАЯ.
Бібліятэка імя Тэнстога ВОЙЦАВА.
Завод «Большэвік» ГАРОДКІНА.
Бібліятэка клуба будаўнікоў ІОФЕ.

Ляжаць кіпы не разгледжаных заяў

(Ліст брыгады).

Не гледзячы на рад канкрэтных пастаноў і ўказанняў ЦКК-НК РСІ аб хуткім і чулым рэагаванні на скаргі працоўных, гэтыя дырэктывы і ўказанні не выконваюцца ў радзе **лагойскіх** арганізацый. Прывядзем некалькі фактаў.

У РВК няма адказнага за прыёмку і ўлік заяў. Тут ляжаць на працягу некалькіх месяцаў нераглядженымі **57** заяў калгаснікаў.

У райса ляжыць **41** заява ад выключаных з калгасаў. Ляжаць гэтыя заявы на працягу трох і больш месяцаў без усякага руху. Заявы і скаргі валяюцца на сталах і лаўках райса, значная частка іх згублена.

Калі з'явілася брыгада ў **райфа, то** загадчык т. **Качаў**, не жадаючы выдаць сваёй бязрэйнасці і бюракратычных адносін да скарг працоўных, стаў на дыбы і не дапускаў праверыць, у якім становішчы знаходзіцца гэтая справа, а калі брыгада стала спасылацца на апавядныя пастановы ЦКК і патрабавала дапусціць да праверкі, то **Качаў** даставаў з таго, што «гэтыя пастановы датычаць Менска, а не Лагойска, няма чаго тут правяраць».

Не лепш стаіць справа і ў сельсоветах. У бюракратычных нетрах старшыні **Кузлўскага** сельсавета т. **Петраноўскага** ляжаць **120** заяў; многія з іх ляжаць па паўгода і больш.

Амаль такое-ж становішча са скаргамі ў **Лагойскім** сельсавеце (старшыня **Сказінскі**) і ў радзе іншых сельсоветаў Лагойшчыны. **Мы ўпэўнены, што лагойская РКК РСІ зоймецца гэтым пытаннем і паложыць канец бюракратычнаму марынаванню заяў і скарг працоўных.**

МІХАЙЛОЎСКІ.

ПА СЛЯДАХ НАДРУКАВАНЫХ ЛІСТОЎ

Ашуканцаў дзяржавы пад суд

У нумары 224 «Звязда» змясціла ліст аб тым, што калгас імя Леніна, Вендражанскага сельсавета (Магілеўшчына), па ўказцы варожых элементаў, прывёз на здатачны пункт пруты зусім непадобраякаснай бульбы для здачы дзяржаве.

Магілеўская пракуратура праверыла матэрыял «Звязды» і паведамляе, што факты поўнасцю пацвердзіліся. Следствам устаноўлена вінаватасць у гэтым члена праўлення калгаса — **Ульянава Восіпа** і калгасніка **Бяешына Сцяпана**. Следства аб іх закончана і справа перадана ў суд для слухання вынезной сесіі народнага месцы—у калгасе.

„Прыёмачны апарат падобран з чужакоў"

«Звязда» (№ 227) надрукавала ліст аб засмечанасці класава-чужымі элементамі прыёмачных пунктаў: **Чашнікі** і **Вятна**.

Дырэктар Белказашлоцгарадніны па ведамляе, што факты адпавядаюць сапраўднасці. Апарат указаных прыёмачных пунктаў ачышчан ад варожых элементаў і вінаватыя ў абвешчанні здатчыкаў прыцягнуты да судовай адказнасці. Райзагс **Збельзін** за дапушчэнне гэтых здачыкстваў на пунктах з работы знят і справа накіравана ў суд.

АПАВЯДАННЕ КАМАНДОРА

Юр. Лявонны

Невялікая ўтульная зала Дома Чырвонай арміі напружана лавіла кожнае слова камандора прабега, толькі што ўзнагароджанага ордэнам Леніна, Аляксандра Максімавіча Мірошкага.

***

Аўтапрабегі не ўпершыню арганізуюцца ў Совецкім саюзе. Апошні, найбольш значны прабег быў у 1925 годзе. У ім удзельнічалі 97 машын, але з іх 95 — замежныя. У прабегу-ж гэтага года — Масква — Кара-Кум — Масква ўзялі ўдзел 25 машын, і з іх — 23 нашай, совецкай вытворчасці. Гэты прабег з'явіўся экзаменам нашага аўтатранспарта, ён з'явіўся генеральнай праверкай якасці нашых рухавікоў, нашай гумы.

У задачы прабега ўвахопіла гаксама вывучэнне магчымасці звязацца сухапутнай трасай з портам Красноводскам і маклівасці экзамінічнага і культурнага асваення пустыні.

Выключнай энергіяй і настойлівасцю, праяўленай усімі ўдзельнікамі прабега, гэтыя задачы бліскуча выкананы. Даволі паказаць на тое, што аднадная з машын, прайшоўшых праз 19 рэспублік, краёў і абласцей, пасля 10.200 кіламетраў дарог і бездарожжа, не выбыла са строя. Цікава, што толькі ў адной машыны б. АМО зламалася рэсора ўжо за 40 кіламетраў ад Масквы, калі наблізаўся фініш, пры чым выпадкова зламалася на выбоіне добрай шасейнай дарогі!

Нашы машыны, даруланыя клапатлівым, бярэжлівым вазіцелям, даказалі, што яны не толькі не ўступаюць, а ў некаторых адносінах і стаяць значна вышэй за імпартныя.

***

Мы ехалі розными дарогамі, — асфальтавымі і брукаваным шасэ Масква — Горкі, глінабітнымі, надовы чай добрымі дарогамі Чувашы, ямамі і калдобінамі Татарыі, натуральнымі дарогамі Казакстана. Усё было нічога! Сапраўдны іспыт пачаўся ад Харэзмскага аазіса да самага горта Красноводска.

Яшчэ ў пачатку гэтага стагодзя буржуазны вандроўца-даследчык Вамбэры пісаў, што яму не давялося ў жыцці бачыць нічога страшнейшага, чым пустыня Кара-Кум. «Там, на вяршынях Усць-Урта, веюць сапротныя ветры і толькі белыя косці загінуўшых лошдей і вярблюдаў аздабляюць сабой мёртвыя прасторы»... Ад Ташаўза мы ўступілі ў гэтую пустыню...

Даныя метэраалагічных станцый паказваюць, што ў гэты год тэмпература на месцах нашага прабега была як раз невысокая. Яна даходзіла «ўсяго»... да 58° у цяньку!... Тэмпература скураных сядзеньняў у машынах дасягала 78°.

— Дзянёк сёння не жаркі, — флегматычна заўважвалі нашы праваднікі — Султан Мурад і Кепыс Шых, — летась ўдвая цяплей было!

І вось у такім «прахладцы», сыпучымі барханамі, дзесяткамі і сотнямі кіламетраў часамі прыходзілася цягнуць ляжкія машыны (іх было ў нас тры, вытворчасці завода імя Сталіна, б. АМО), літаральна на сваіх плячах. І, напрыклад, ад Каракуля да Ферабы 16 кіламетравую адлегласць мы прайшлі ў 18 гадзін...

Машыны ішлі на шырокіх пакрышках — эвышбалонах, пад іх падкладаліся вярбовачныя лесвіцы, спецыяльныя гумавыя стужкі, машыны йшлі сыпучымі пяскамі, купінамі, саксаўламі — і пустыня, упарта супраціўляючыся, саступала!

***

Дзе-ні-дзе траплялася старыя, ветхія масты праз высахшыя арыкі. Стагодзіня масты не чакалі, зразумела, спаткання з маскоўскай аўтакалонай — і не падрыхтаваліся да належнай сустрэчы! Яны ірвіліся ўпчэнт пад калёсамі аўтамабіляў, ляцелі на дно, рушачы берагі і рэдкую расліннасць.

З намі ехалі акадэмікі, журналісты, шоферы, — але, да душы, да спецыяльнасці кожнага з іх зараз смела можна далучыць яшчэ адну — маставое будаўніцтва! Недарма замест шасці зламаных намі мастоў вырасла восем новых...

На адным з этапаў нашага падарожжа мы трапілі ў невялікае паселішча Куня-Ургенч з 300—400 жыхарамі. Аказваецца, калісці тут быў вялізарнейшы горад з 4 мільёнамі насельніцтва. Гэта было каля 3-х тысяч год таму назад. Горад і па сёнешні дзень носіць на сабе сляды прабывання Аляксандра Македонскага.

У гэтым горадзе мы знайшлі старадаўні помнік, складзены з дзіўных, шакаладных цаглін. Вучоныя, якія былі ў нашай калоне, бесперамылкова азначылі, што гэтыя цаглины становяць сабой надвычайную мешчыну гліны, малака і яйкавага жаўтка. Калі мы паспрабавалі давядзіцца, чым з'яўляецца гэты помнік, старыя людзі з Куня-Ургенча заявілі:

— Гэта — пляменнік бога!

Да рэчы, статуя «пляменніка бога» мае замест рота шчыліну, куды прававорныя павіны былі апускаць адпаведныя манеты...

Горад Куня-Ургенч быў знішчан бяглігаснымі пяскамі Кара-Кума.

***

Для таго, каб скарачыць на некалькі сот кіламетраў шлях падарожжа, мы паспрабавалі ехаць рочышчам высахшага Сарокамышскага возера, уздоўж Усць-Урта. Першыя 15-16 кіламетраў прайшлі без прыгодаў; застылая твань трымала машыны досыць добра. Але неўзабаве машыны АМО пачалі правальвацца і грузнуць.

Аўрал! І тут акадэмікі і журналісты, вадзіцелі і мастакі дружным напорам ратавалі машыны, выцягвалі іх з багны і скіроўвалі на другі, больш шэўны шлях.

***

Насельніцтва тых раёнаў, праз якія нам даводзілася праязджаць, праяўляла выключную цікавасць да мэт і задач прабега, імкнулася ўсямерна дапамагчы нам. Вось некалькі характэрных дробязяй.

Каля Натыр-Бека, недалёка ад Харэзмскага аазіса, мы спаткалі «маладога чалавека» год 5-ці, які сталіў на дарозе, працягнуўшы насустрач ручонку са шклянкай кумыса. Калі галаўная машына спынілася і мы распыталі хлапчука, у чым справа, аказалася, што гэта — прадстаўнік бліжэйшага калгаса... Мы так і ахрысцілі яго: «самы малады паўпред у свеце»!

Побач з гэтым быў і другі выпадак. Асцюйчы мы ўступілі ў размову са старым дэхканінам узбекам, які ўпарта дамагаўся, каб мы паказалі яму Сталіна. Мы гаварылі яму, што вось мы — сталінцы, што вось — сталінскія машыны, але тав. Сталіна няма з намі.

— Няма чаго тлуміць мне галаву, — адказваў стары, — я ведаю, што вы лічыце мяне за непісьменнага, адсталага. Хіба я не ведаю, што ў кожнай справе, якая бярэ пачатак у вас, у Маскве, асабіста ўдзельнічае тав. Сталін?! Пакажыце мне жывога тав. Сталіна!

... Вы ведаеце, што такое азіяцкі пыл? Гэта пыл, які залягае на дароге пластом у ½ — 1½ метра, які мае ў сабе 17 проц. крэмнія, ад якога няма ратунка. За дзень яны ў машыне ён робіць людзей неадрозным адзін ад другога, бо залягае на твары таўшчынёю ў некалькі міліметраў...

І вось у адным сяленні, якое да ведалася пра наш праезд, жыхары спецыяльна, на працягу некалькіх гадзін, паклівалі дарогу, каб захаваць машыны і нас ад гэтай жудасці.

Прабыванне аўтакалоны ў Сярэдняй Азіі лічылася нацыянальным святам. Недарма сакратар Сярэдня-Азіяцкага бюро ЦК УсеКП(б) т. Шадунц заявіў:

— Гэта — не столькі ваша, як наша свята!

\

ПАВЕДАМЛЕННЕ ФІЛІПСА

ВАШЫНГТОН, 22 лістапада. (БЕЛТА).

Выконваючы абавязкі міністра замежных спраў Філіпс апублікаваў наступнае паведамленне:

«У адпаведнасці з сумеснай заявай Рузвельта і Літвінава ад 16-га лістапада, паміж Літвінавым і прадстаўнікамі міністэрства замежных спраў і міністэрства фінансаў вяліся далейшыя перагаворы. З прычыны складанасці пытанняў, падлягаючых разгляду, аказалася немагчымым прыйсці да шэўных вынікаў да ад'езда Літвінава. Прадстаўнікі абодвух урадаў будуць актыўна працягваць перагаворы. Гутаркі, меўшыя месца да гэтага часу, выявілі жаданне абодвух урадаў дасягнуць хуткага вырашэння гэтых пытанняў».

ЗАЯВА ТЭФФІК РУШЮ-БЕЯ

СТАМБУЛ, 23 лістапада. (БЕЛТА). Міністр замежных спраў Турцыі Тэффік Рушдю-бей на пытанне карэспандэнта ТАСС па повазу ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж ПАЗШ і СССР зрабіў наступную заяву:

«Мой урад у вышэйшай ступені задаволен устанаўленнем адносін паміж СССР і Амерыкай.

Усякі акт, які спрыяе ўстанаўленню сусветнай гармоніі і ўмацаванню міра, сустракаецца намі з глыбокім задаваленнем. Асабліва калі ідзе справа аб згодзе з нашым бліжэйшым прыяцелем — Совецкім саюзам і краінай, як ПАЗШ, якая заўсёды прыязна адносілася да Турцыі.

Не магу лепш сказаць па гэтаму повазу, як паўтарыць словы вашага прэзідэнта Калініна ў звароце да амерыканскага народа, што ўсякі, каму дораг прагрэс чалавецтва і справа ўсеагульнага міра, павінны радавацца аднаўленню совецка-амерыканскіх адносін».

ДА ПРАБЫВАННЯ М. М. ЛІТВІНАВА Ў ПАЗШ

1. М. М. Літвінаў пакідае параход «Берынгарыя», пасаджаючыся на ўрадавы катэр, які адвозе яго ў Н'ю-Джэрсей для далейшага следавання цягнікам у Вашынгтон.
2. Тав. Літвінаў перад ад'ездам з Джэрсей-Сіці ў спецыяльным цягніку ў Вашынгтоне на пляцоўцы свайго вагона выказвае некалькі слоў перад мікрафонам радыё-перадачы.
3. Масы журналістаў і грамадскіх дзеячоў праводзілі цягнік, на якім адпраўлялася М. М. Літвінаў і яго спадарожнікі ў Вашынгтон.
4. Дзяржаўны сакратар (міністр замежных спраў ПАЗШ) Кордэлл Хэлл вітае тав. Літвінава ў момант прыбыцця яго ў Вашынгтон. Злева направа: палкоўнік Пуотсон, адъютант Белага дома, Літвінаў, Хэлл і сакратар прэзідэнта Рузвельта.
5. Прыяцельская гутарка М. М. Літвінава з міністрам замежных спраў Хэллам у Белым доме.
6. Інтэрв'ю, данае тав. Літвінавым карэспандэнту «Ассошыэйтэд прэс» і ўпаснаручна ім падпісанае.
7. Тав. Літвінаў на ганку Белага дома перад другой сустрэчай з прэзідэнтам Рузвельтам.

2



3

4

5



6



7

САКРЭТНЫЯ ДАКУМАНТЫ ГЕРМАНСКАГА УРАДА

ПАРЫЖ, 22 лістапада. (БЕЛТА).

«Ліці парыз'ен» апублікавала новы дакумант ад верасня 1933 г., які змяшчае сугуба сакрэтныя інструкцыі цэнтральнага бюро прапаганды пры германскім урадзе.

Дакумант прысвечан пытанню аб выхадзе Германіі з Лігі нацый і з канферэнцыі па раззбраенню.

«Рашэнне Германіі аб выхадзе з Лігі нацый, — падкрэслівае дакумант, — не падлягае адмене, пакуль дэкларацыяе знешня-палітычнае становішча не зменіцца. Пераглед рашэння Германіі магчым толькі, калі будзе пераглядзен Версальскі дагавор».

«Паводле вестак, зыходзячых ад прыяцельскага ўрада, трэба чакаць, што канферэнцыя па раззбраенню не будзе проста закрыта, але што шляхам адтэрмінавання яе работ захаваюць відочнасць яе існавання. Вось чаму германскі ўрад паставіць пытанне: ці раззбройваюцца іншыя краіны і ў якой меры? Калі, як гэтага трэба чакаць, германскі ўрад атрымае незадавальняючы адказ, ён заявіць адкрыта перад сусветнай грамадскай думкай, што Германія мае права вызваліцца ад палажэнняў Версальскага дагавора па пытанню аб узбраеннях».

Далей у інструкцыі гаворыцца:

«Германскі ўрад распрацоўвае дыректывы для праграмы актыўнай знешняй палітыкі. Калі ў гэтай праграме адкрыта і не будзе выстаўлена патрабаванне аб разрыве Версальскага дагавора, дык усё-ж гэта патрабаванне не будзе і адмаўляцца».

Па слядах Гітлера

РЫГА, 22 лістапада. (БЕЛТА).

Радка латвійскі сойм прааўляў такую «працаздольнасць», як на ўчарашнім пасяджэнні, калі разглядалася пытанне аб арышце дэпутатаў рабоча-сялянскай фракцыі. Пасяджэнне зацягнулася да гадзіны ночы.

Дакладчык, член сялянскага саюза Межраўп матываваў патрабаванне аб арышце дэпутатаў рабоча-сялянскай фракцыі тым, што ўсе яны нібыта належаць да кампартыі, а калі і не належаць, усё-ж іх дзейнасць носіць комуністычны характар.

Соцыял-дэмакрат Менцэрс крытыкаваў увесь абвінавачучы матэрыял з фармальна-прававога пункта гледжання. Істотную частку матэрыяла складаюць «паліцэйскія даныя», якія нават у дарэволюцыйных царскіх судах не лічыліся дастатковымі для абвінавачання.

Есць між іншым агентурныя паведамленні, што, калі на дэманстрацыі бесправоўных 16-га лютага пачуліся комуністычныя лозунгі, на твары дэпутата Рутыня іграла «комуністычная ўсмешка». Менцэрс прыпоў да вывада, што ў даным выпадку адбываецца «палітычная расправа буржуазіі над левай часткай рабочых».

Усе члены рабоча-сялянскай фракцыі — Гульбіс, Рутынь, Берг, Матысон, Лапінь і Біттэ ўказвалі, што рабоча-сялянская фракцыя ліквідуецца за тое, што абараняла інтарэсы рабочых, выступала ў абарону СССР, заклікаючы рабочы клас не толькі да захавання ней траліта, але і да актыўнага выступлення ў выпадку нападу на Совецкі саюз і абараняла адзіны фронт рабочых.

— Адным словам, — заявілі дэпутаты рабоча-сялянскай фракцыі, — буржуазія паранупыла ліквідаваць фракцыю за выкананне наказа, дадзенага яе дэпутатам 75 тыс. выбаршчыкаў.

«Фашысцкія ветры веюць над Латвіяй, — сказаў Гульбіс, — і таму патрэбна ліквідацыя рабоча-сялянскай фракцыі».

Матысон заявіў, што буржуазія можа ліквідаваць рабоча-сялянскую фракцыю, але «рэвалюцыйны рабочы рух гэтым не будзе ліквідаван».

Сойму было прапанавана галасаваць тры пункты: 1) выдаць рабоча-сялянскіх дэпутатаў суду з адхіленнем іх ад пасяджэнняў сойма; 2) даць згоду на прымусовы прывод да судовага следчага і 3) дапусціць арышт усіх рабоча-сялянскіх дэпутатаў.

57 галасамі супроць 29 быў прыняты першы пункт, пасля чаго рабоча-сялянскія дэпутаты былі адхілены ад далейшага галасавання. Пункт аб арышце быў прыняты 57 галасамі супроць 20, пры трох устрымаўшыхся.

З выгукамі «Далоў фашысцкі ўрад, нехай жыве рабоча-сялянскі ўрад!» і са спевам «Інтэрнацыянала» рабоча-сялянскія дэпутаты пакінулі залу. З сойма агенты ахранкі і ахова сойма выштурхалі рабоча-сялянскіх дэпутатаў на вуліцу, дзе іх чакаў натоўп паліцэйскіх і турэмны аўтабус.

ЗНОУ АДТЭРМІНОЎКА...

ЖЭНЕВА, 22 лістапада. (БЕЛТА).

Бюро канферэнцыі па раззбраенню пасля заявы Гендэрсона ўхваліла рашэнне нарады прадстаўнікоў ПАЗШ, Англіі, Францыі і Італіі з Гендэрсонам і Бенешам адтэрміновать сесію генеральнай камісіі канферэнцыі па раззбраенню да 15-га студзеня.

УРАД „НЕЗАЛЕЖНАГА" ФУЦЗЯНА

ЛОНДАН, 22 лістапада. (БЕЛТА).

Згодна паведамлення «Таймс», наступныя асобы ўвайшлі ў склад новага «незалежнага» ўрада Фуцзяньскай правінцыі: старшыня ўрада Лай Чай-сум, старшыня палітычнага совета Чэн Мінсю, старшыня ваеннага совета Цай Тынкай, старшыня фінансавага совета Су Шын-чын, міністр замежных спраў Бэ-тсзій Чэн.

Урад апублікаваў манифест, у якім абвяшчае ўрачыстае перадзел зямлі.

«Таймс» указвае, што гэта, як відаць, фармальны лозунг, разлічаны на тое, каб набыць падтрымальнікаў аграрных элементаў. Згодна другіх паведамленняў праграма прадугледжвае ліквідацыю не раўнапраўных дагавораў, супрацьўленне Японіі, перадачу ва ўладанне дзяржавы зямель, лясоў і капальняў, свабоду стачак і рэлігіі.

Як паведамляе «Дэйлі геральд», нанкінскі ўрад даў загад аб пасылцы войск супроць Фуцзяньскага ўрада. Згодна паведамленню агенцтва Рэйтэр, паўстаўшыя разгромілі два батальёны кітайскіх маракоў у Амоі і захапілі тэлеграф і радыёстанцыю ў Фучжоу. Паводле слоў шанхайскага карэспандэнта «Дэйлі тэлеграф», адкрыта абмяркоўваецца пытанне аб японскай інтэрвенцыі ў Фуцзяне.

НЯЎСТОЙЛІВАЕ СТАНОВІШЧА ГАБІНЕТА САРРО

ПАРЫЖ, 22 лістапада. (БЕЛТА).

Учора ў палаце дэпутатаў пачалася агульная дыскусія па ўраду Саррамаму фінансавому законапраекту. Апроч генеральнага дакладчыка Жак'е выступілі міністр бюджэта Гардэ, дэпутаты групы Марэна і Фроссар.

Фроссар заявіў, што аднародны радыкальны ўрад, які апіраецца на большасць парламента, створаны майскімі выбарамі, аказаўся нетрывалым па віне радыкалаў, і пэўн цяпер магчыма стварэнне габінета левага картэля ў складзе соцыялістаў і радыкалаў.

Соцыялістычная партыя, паводле слоў Фроссара, не адмаўляе магчымасці стварэння габінета левага картэля. Калі-ж гэты вопыт не ўдасца, дык соцыялістычная партыя не будзе перашкаджаць супроць роспуска палаты. Гэта заява Фроссара была пакрыта апладысментамі соцыялістычнай фракцыі на чале з Блюмам.

Увесь друк канстатуе, што для ўрада Саррамаму складваецца неспрыяльная абстаноўка і лічыць зусім магчымым яго падзенне.

ЯПОНІЗАЦЫЯ МАНЧЖУРЫІ

БЕЙПІН, 22 лістапада. (БЕЛТА).

«Бейпін кронікль» друкуе інтэрв'ю з кітайскім рэзідэнтам, пражываючым у Гірыне (Манчжурыя), які прыбыў у Бейпін.

Паводле яго слоў, дзякуючы высокім тарыфам, устаноўленым марыянетачным Манчжоу-Го на імпартныя тавары, за выключэннем японскіх — усе амерыканскія, ангельскія, французскія тавары, якія заўсёды знаходзілі рынак у Манчжурыі, зараз заменены японскімі.

З усіх ваенных сіл, размешчаных у розных раёнах Манчжурыі і Жэхе, толькі 10 проц. — кітайскія, рэшта — японскія. Звыш 5 тыс. японскіх дэзерціраў размешчана ў даліне Сунгары з цэнтрам у Сальсіне.

Усе дзеці ў манчжурскіх школах з самага пачатку іх навучання вывучаюць японскую мову. Усе кнігі, па якіх навучаюцца ў школах Манчжурыі, прапітуты прынцыпам што Японія, Манчжурыя і Карэя складаюць адзіную дзяржаву.

НОВАЯ АДПРАЎКА ВОЙСК У МАНЧЖУРЫЮ

ТОКІО, 23 лістапада. (БЕЛТА).

Рад газет адзначае, што 22 лістапада адбылася адпраўка ў Манчжурыю вайсковых часцей.

Адпраўка суправаджалася хваляваннямі. На цэнтральны вакзал, паводле слоў агенцтва Сімбун рэнго, з'явілася столькі праваджаючых, што ўлады спынілі далейшы доступ.

Праважаючыя, аднак, не падпачаліся распарадкоўцю паліцыі, разнеслі білетную касу, уварваліся на платформу і збілі чыгуначнікаў. Былі выкліканы атрады паліцыі і японскай жандармерыі.

«У провадах», паводле слоў агенцтва Сімбун рэнга, прымала ўдзел звыш 30 тыс. чалавек.

ПАХАВАННЕ АХВЯР ПАВЕТРАНАЙ КАТАСТРОФЫ

22 лістапада ў Харкаве адбылося пахаванне таварышоў, загінуўшых у часе катастрофы з самалётам «К-7».

У залі клуба сувязі поруч трупамі прайшлі дзесяткі тысяч рабочых, работніц і чырвонаармейцаў, прышоўшых аддаць апошні доўг загінуўшым на пасту таварышам.

З клуба труны былі вынесены бліжэйшымі прыяцелямі і паплечнікамі нябожчыкаў. На аўтамашынах, за якімі расцягнулася шматтысячная жалобная працэсія, труны з целамі ахвяр катастрофы былі дастаўлены на брацкія могілкі.

Аддаць апошні доўг загінуўшым з'явіліся: Грыгор Іванавіч Пятроўскі, т. т. Сухамлін, Хвыля і іншыя члены украінскага ўрада, а таксама прадстаўнікі шматлікіх партыйных, прафсаюзных і грамадскіх арганізацый.

На могілках труны пад гукі жалобнага марша былі апушчаны ў брацкую магілу. На жалобным мітынгу, прысвечаным памяці загінуўшых таварышоў, ад імя ўрада Украіны выступіў тав. Сухамлін. З развітальнымі прамовамі выступілі таксама прадстаўнікі ад калектываў харкаўскага аўіязавода і авіяінстытута.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР
(вул. Валодарскага, 7, тэл. № 21-813)
Сёння, 24 лістапада
РЭКРУТ
Пастаноўка з аслуж. артыста рэспублікі
М. Ф. РАФАЛЬ НАГА.
Пачатак у 8 гадз. вечара.
Білеты, узятыя на 18-11, сапраўдны на 25-11.

Беларускі Дзяржаўны тэатр Оперы і балета
(памяшканне БДТ—1)
24 лістапада ОПЕРА
КАРМЕН муз. Бізэ
Рэжысер—Багыровіч Ольга.
Гал. дырыжор—Гітгарц І. А.
Пач так роўна у 8 гадз. веч.

Чырвоная зорка — Вялікі замежны фільм Калі раستане снег. У гал. ролі Мэры Пікфорд
Кіно „Інтэрнацыянал" — Каса ад 1 г. дня. Замежны мастацкі фільм СПРАВА БЛЕРО
„Спартак" — Каса—з 4 г. дня. Замежны фільм БЕЛАЯ МОЛЬ
Кіно „Пролетарый" — Замежны мастацкі фільм Цыганка Марцана (гішпанская танцоўшчыца)
Дзіцячы гукавы кіно-тэатр — Мастацкі фільм ФРЫЦ БАУЗР

АБ'ЯВА АБ РЭГІСТРАЦЫІ
Народным камісарыятам фінансаў БССР
дваццаць першага лістапада 1933 г. на падставе арт. 2—4 палажэння аб дзяржаўнай рэгістрацыі ад 9-2-31 г. (збор закон. і загадаў Урэда СССР № 8, паст. 99)
зарэгістравана
ў рэестры юрыдычных асоб пад № 158 (сто пяцьдзесят восем)
палажэнне аб Аддзеле Рабочага Забеспячэння Белдзярніторфа (АРЗ Белдзярніторфа).
Адрас АРЗ'а Белдзярніторфа—г. Менск, Шырокая, д № 74-а.

Аргмасавы аддзел і мандатная камісія Менскага Гарсовета
даводзяць да ведама ўсіх членаў і кандыдатаў горсовета, што з 20-XI—33 г. праз адпаведныя секцыі
ПАЧАЎСЯ АБМЕН старых МАНДАТАЎ
членаў і кандыдатаў гарсовета НА НОВЫЯ ўзоры 1933 года.
Абмен праводзіцца ў памяшканні гарсовета (вул Карла Маркса, 14, 3 паверх, пакой № 49) ад 9 да 4 гадз. дня і ад 8 да 10 гадз. вечара.
Аргмасавы Аддзел Гарсовета, Мандатная Камісія.

ПРАБУДУЕМ Эскадрыллю імя т. Кагановіча

На бягучым рахунку 1.189.157 руб.

За 21 лістапада на бягучы рахунак Дзяржбанка № 7814 у фонд пабудовы эскадрыльі імя т. Кагановіча паступіла 2.498 руб., у тым ліку ад заўкома МДЭС — 231 руб., швейнай фабрыкі «Кастрычнік» — 595 руб., калектыва работнікаў дзіцячага сада № 14 —16 руб., з Полацкага раёна — 778 руб., Парыцкага — 329 руб. і г. д.

За 22 лістапада паступіла — 1.023 руб., у тым ліку з Лельчыцкага раёна — 610 руб., Мсціслаўскага—339 руб., ад гаражы — 73 руб.

Усяго на бягучым рахунку Дзяржбанка 1.189.157 руб.

Уносяць і выклікаюць

На выклік тав. Шапіра ўнашу на пабудову эскадрыльі імя тав. Кагановіча 25 руб. і выклікаю наступных таварышоў: Муц (Рэчыцкі леспрамгас), Рэйдэр (Старобіна), Самца (Чэрвень), Зльперына (Бярэзіна), Кліста (Плешчаніцы), Крэйзельман (Смалявічы), Блоцкага (камбінат «Комінтэрн» — Нова-Барысаў), Шульгіна (шкловавод імя Доўгаля), Дзянскага (камбінат «Пролетарская перамога»), Сомнічкіна (макаронная фабрыка імя Леніна).

ШУЛЬГІН.

На калгасах і вёсках Уладзімірскага сельсовета, Клічаўскага раёна, разгорнута масава-растлумачальная работа па зборы сродкаў на пабудову эскадрыльі імя т. Кагановіча. Адна толькі Дубленаўская ШКМ сабрала сярод вучняў 50 руб. Усяго па сельсавету сабрана 200 руб. Збор працягваецца. Актыў калгаснікаў разам з актывам прапоўных аднаасобнікаў вы кліча на спаборніцтва Кабыльянскі сельсавет. Асабліва жыва адгукнуліся на гэту справу калгаснікі калгаса «Авангард», якія сабралі каля 130 руб.

Я. Ліссўскі.

Грузінскія совецкія пісьменнікі ў Менску

21 лістапада ў Менск прыехалі старэйшыя пісьменнікі Грузіі, белетрысты — т. т. М. ДЖАВАХІШВІЛІ, аўтар вядомых раманаў «Белы каўнер», «Абаэ», «Арсен з Марабды» і Н. ЛОРДКІПАНІДЗЕ, аўтар раманаў «Грозны пан», «Са сцежак на дарогу» і інш. Пісьменнікі робяць падарожжа па СССР па маршруту: Тыфліс — Масква — Ленінград — Менск — Харкаў. Мэта іх паездкі — азнаямленне з дасягненнямі соцыялістычнага будаўніцтва брацкіх рэспублік і папулярызацыя творчасці лепшых грузінскіх пісьменнікаў сярод шырокіх працоўных мас Саюза.

У дзень прыезда адбылася таварыская сустрэча т. т. Джавахішвілі і Лордкіпанідзе з актывам беларускіх совецкіх пісьменнікаў. Увечары госці былі на спецыяльна арганізаваным праглядзе фільма «Першы ўзвод» і гукавой хронікі вытворчасці Белдзяржкіно.

22-га і 23-га пісьменнікі ў суправаджэнні прадстаўнікоў аргкамітэта ССПБ аглядалі чырвоную сталіцу БССР,—наведалі Універсітэцкі гарадок, новабудоўлі Акадэміі навук і Дома Саўгаса, заводы «Комунар», імя Варашылава, швейную фабрыку «Акцябр».

22 лістапада ў Доме Камасветы грузінскія таварышы, разам з беларускімі паэтамі і пісьменнікамі — т. т. АЛЕКСАНДРОВІЧАМ, БРОЎКАМ, ГЛЕБКАМ, МУРАШКАМ, КРАПІВОЮ і польскім паэтам КАВАЛЬСКІМ, выступалі на літаратурным вечары менскага партыйна-комсамольскага актыва.

У сваім прывітальным слове НІКО ЛОРКІПАНІДЗЕ выказаў надзею, што ў далейшым абмен вопытам, творчая сувязь і ўзаемадапамога паміж літаратарамі Грузіі і БССР будзе ўзмацнецца на глебе інтэрнацыянальнага пролетарскага адзінства. МІХ. ДЖАВАХІШВІЛІ прачытаў урывак з свайго новага рамана «Арсен з Марабды», надаўна перакладзенага на рускую мову.

Учора ўвечары т. т. Джавахішвілі і Лордкіпанідзе ўдзельнічалі ў агульным сходзе пісьменнікаў Менска.

Т. т. Джавахішвілі і Лордкіпанідзе марнуюць у часе свайго прабывання ў БССР наведаць нашы буйнейшыя прамысловыя цэнтры — Гомель і Бабруйск, дзе наладзяць літаратурныя выступленні перад шырокай рабочай аўдыторыяй.

Л.

Нарада яўрэйскіх совецкіх пісьменнікаў

У сувязі з падрыхтоўкай да ўсесаюзнага з'езда совецкіх пісьменнікаў у Маскве склікаецца нарада яўрэйскіх совецкіх пісьменнікаў. Для правядзення нарады ўсесаюзны аргкамітэт ССП выпучыў спецыяльную камісію. 30 лістапада адбудзецца першае пасяджэнне камісіі, на якой будуць заслуханы справаздачы яўрэйскіх секцый рэспубліканскіх аргкамітэтаў.

Ад яўрэйскай секцыі ССПБ на нараду паедуць пісьменнікі ХАРЫК, КУЛЬБАК, АКСЕЛЬРОД, БРАНШТЭЙН, ДУНЕЦ, КАЦОВІЧ і ЮДЭЛЬСОН.

(БЕЛТА).

Паведамленні

Культпроп гаркома партыі паведамляе, што 24-га лістапада 1933 года а 7-й гадзіне ўвечары ў памяшканні Дома Камасветы адбудзецца прэнсемінарый па гісторыі партыі і кандыдацкай школе.

Уваход з вул. Энгельса, И-й паверх, пакоі 20 і 21.

Яўка прапагандыстаў абавязкова.

КУЛЬТПРОП ГАРКОМА.

Беларускае аддзяленне газеты «Известия ЦИК СССР и ВЦИК» пасля рэарганізацыі прыступіла да работы. Аддзяленне знаходзіцца ў будынку ЦВК БССР (Плац Волі, № 17, першы паверх).

Наведвальнікі прымаюцца штодзённа ад 6, 12, 18, 24, 30 ад 11 гадзін раніцы да 3 гадзін дня. Карэспандэнцыі накіроўваць па вышэйпаказанаму адрасу.

Беларускае аддзяленне газеты «За Коммунистическое просвещение» знаходзіцца ў будынку ЦВК БССР у адным пакоі з аддзяленнем газеты «Известия» (Плац Волі, 17, першы паверх).

Прыём наведвальнікаў штодзённа (акрамя 6, 12, 18, 24, 30) ад 11 гадзін раніцы да 4 гадзін дня. Карэспандэнцыі і матэрыял дасылаць па вышэйпаказанаму адрасу.

Пачалася чыстка парт'ячэйкі ЦКК-НК РСІ БССР

Просьба да ўсіх грамадзянін інспектароў, лёгкіх кавалерыстаў, рабселькораў, рабочых і працоўных г. Менска прыняць актыўны ўдзел у чыстцы.

Пасяджэнне камісіі па чыстцы праходзіць у Доме Ўрада (правае крыло, 4-ты паверх, зала пасяджэнняў) з 6 гадзін увечары.

Камісія па чыстцы.

25-га лістапада г. г. у 6 гадзін вечара ў памяшканні Дома комуністычнай асветы (вул. К. Маркса) адбудзецца
АБ'ЯДНАНАЕ ПАСЯДЖЭННЕ
прэзідыума ЦВК КП(б)Б,
калегіі НК-РСІ і калегіі Народнага Камісарыята Юстыцыі БССР
па пытаннях барацьбы за рэвалюцыйную законнасць на даным этапе.
З дакладам выступіць наркамюст і пракурор рэспублікі тав. КУЗЬМІН.
Запрашаюцца: старшыні і члены вытворча-таварыскіх судоў, групы салідарнасці РСІ і пракуратуры, народныя засядацелі, члены секцый рэвзаконнасці гарсовета, навуковых працаўнікі ІСБП Акадэміі навук, практычныя працаўнікі, студэнты і выкладчыкі Інстытута совецкага права.
УВАХОД ВОЛЬНЫ.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

25 лістапада, у 2 гадзіны дня, у памяшканні клуба комасветы (малая зала) адбудзецца
нарада загадчыкаў ФЗО, ФЗД, важатых баз, па-за школьных работнікаў, выкладчыкаў спеваў і фізкультуры, старшынь камсодаў, загадчыкаў дзіцячых дамоў, загадчыкаў клубаў і загадчыкаў кіно і тэатраў.
Менгарком КП(б)Б.
ГарАНА.

ВЫДАВЕЦТВА ЦК КП(б)Б „ПАРТВЫДАТ"
ВЫШЛА з друку і паступіла ў продаж брашура
В. МОЛАТАЎ.— ДА ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ.
Прамова на пленуме Массовета 6 лістапада 1933 г.
Стар. 20, ц. 15 кап.
Патрабуйце ва ўсіх філіялах і кнігарнях Дзяржвыдбела, райсаюзаў і ВАКТ'а.
Пры адсутнасці на месцах ніцце заказы па адрасу: Менск, Карла Маркса, 14, выдавецтва ЦК КП(б)Б—партвыдат.

ТЭЛЕФОНЫ РЭДАКЦЫІ: Адказны рэдактар—21-352, нам. адказнага рэдактара—25-188, сакратарыят—21-350. СЕКТАРЫ: партыйнага будаўніцтва—21-353, прамысловы—21-354, совецкага будаўніцтва—21-354, дарожнага будаўніцтва—21-354, соц. земляробства—21-355, нацыянальна-культурнага будаўніцтва—21-355, замежнай інфармацыі—25-189, лістоў рабочых і калгаснікаў—21-356. Загадчык выдавецтва—21-358. Выпускаючы—21-357.

Менск, друкарня «Звязды». Галоўлітбал № 332.